ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ
Менск, Пляц Волі № 17
1-шы паверх
ТЭЛ. Сакратара—№ 478 Рэдактара—№ 760 Канторы —№ 244 Сэктара прамысловасьці —№ 615

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 33 (3122) ПАНЯДЗЕЛАК 9 ЛЮТАГА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА
На 1 месяц . — 90 к.
„ 3 „ . 2 р. 70 к.
„ 6 „ . 4 р. — к.
„ 1 год . 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Алма-Ата, Центр. Гос. публ. б-ка 31 янв. 32 г. СР

Руйнуючы ўдар па ворагах ленінскай нацпалітыкі

МАБІЛІЗАВАЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ

НА РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ЗА

- вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўнай небясьпекі на даным этапе,
- беларускага контр-рэвалюцыйнага нац.-дэмакратызму і шавінізмаў ўсіх колераў.
- клясава-інтэрнацыянальнае выхаваньне,
- рашучае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Агонь па ворагах ленінскай нацпалітыкі

Гіганцкі размах сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і ў вёсцы ставіць перад партыйнымі, камсамольскімі, прафсаюзнымі і савецкімі арганізацыямі новыя патрабаваньні, новыя задачы. Той, хто ня хоча быць у хвасьце мас, хто ня хоча скаціцца ў апартуністычнае балота самацёку, павінен перабудаваць сваю работу так, каб яна адпавядала бальшавіцкім тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы будуем новыя волаты-фабрыкі і заводы. Сотні тысяч новых рабочых уліваюцца ў нашу сацыялістычную прамысловасьць. Расьце і мацнее пралетарскі касьцяк у БССР, павялічваецца і робіцца больш вялікай і больш адказнай яго роля ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве. Расьце і ўзмацняецца новымі пралетарскімі кадрамі авангард пралетарыяту КП(б)Б. Пад правільным кіраўніцтвам ленінскага ЦК мы ідзем ад перамогі да перамогі шырокім разгорнутым фронтам сацыялістычнага наступу. Расьце сацыялістычны сэктар народнай гаспадаркі. Магутная хваля калгаснага прыліву штодня ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй. Новыя тысячы дробных распыленых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак пераходзяць на сацыялістычны шлях. На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя сур'ёзная кляса—кулацтва.

Трэці рашаючы год пяцігодкі, год вялізарнейшага размаху грамадзкага, вытворчага і культурнага жыцьця, патрабуе яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў работы ўсіх арганізацый, каб лепш абслужыць інтарэсы шырокіх мас, палепшыць кіраўніцтва. Кожны партыец, камсамолец павінен быць ня толькі ўдарнікам на прадпрыемстве, ня толькі стаяць на чале сацыялістычнага спаборніцтва, а павінен быць ударнікам у сацыялістычна-грамадзкім жыцьці, ударнікам за культурную рэвалюцыю, ударнікам за новы быт.

Аднак, на справе мы бачым, што яшчэ ня ўсе арганізацыі перабудавалі сваю работу на сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы, што творчая ініцыятыва і энтузіязм мас не знаходзяць належнага кіраўніцтва ў штодзённай работе, што апартуністычны разьлік на самацёк ня зьнічаны цалкам. Мы маем усе магчымасьці, усе ўмовы для таго, каб зьнішчыць гэтыя хібы і рухацца больш хутка наперад з тым, каб у найбліжэйшы час «дагнаць і перагнаць» перадавыя капіталістычныя краіны.

«Мы адсталі ад перадавых краін на 50—100 год. Мы павінны перабегчы гэты прамежак у 10 год. Альбо мы зробім гэта альбо нас самнуць».—Так сказаў тав. Сталін на I-ай Усесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловых прадпрыемстваў. І гэта павінен вывучыць і памятаць кожны партыец, кожны камсамолец і кожны рабочы-калгасьнік і гэта павінны праводзіць з усёй рашучасьцю, з усёй пасьлядоўнасьцю ў жыцьцё. Для гэтага мы павінны напружыць усе свае сілы, мабілізаваць усе сродкі, каб за гэты адрэзак часу сапраўды стаць перадавой краінай.

Бурны рост нашага сацыялістычнага будаўніцтва адбываецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах шалёнага супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў. Нэпман, кулак, шкоднік усімі мерамі і ўсімі спосабамі і сродкамі стараюцца затармазіць, сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва. Для гэтага яны скарыстоўваюць не толькі абрэз і шкодніцтва. Клясавы вораг прыкладае ўсе сілы для таго, каб паслабіць сталёвую адналітнасьць ленінскай партыі, каб унесьці ў рады рабочай клясы нацыянальную розьнь.

Сёньня мы друкуем факты паасобных вылазак клясавага ворага—антысэмітаў, шавіністаў. Гэтыя факты сыгналізуюць аб тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі занядбалі інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых мас, што грамадзкая работа, работа па ўзьняцьці культурнага ўзроўню ў загоне. Нават больш таго, не заўсёды даецца дастаткова рашучы адпор на вылазкі клясавага ворага, не заўсёды па паасобных выпадках вядзецца растлумачальная выхаваўчая работа. Факты выступленьняў вялікадзяржаўных шавіністаў за апошнія часы значна ўзрасьлі. Вялікадзяржаўныя шавіністы, прыкрываючыся «інтэрнацыяналізмам» фактычна выступаюць супроць правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. У замаскаванай і ў адкрытай форме яны зрываюць мерапрыемствы партыі і ўраду ў правядзеньні беларусізацыі, у каранізацыі апарату.

Контрэвалюцыйныя беларускія нацыянал-дэмакраты імкнуцца супроцьпаставіць сапраўднаму бальшавіцкаму інтэрнацыянальнаму выхаваньню рабочых калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сваю буржуазную тэорыю самабытнасьці і аднолькавасьці інтарэсаў «ўсяго народу». Гэтым самым яны імкнуцца супроцьпаставіць нацыянальны фронт клясаваму фронту, паслабіць клясавую пільнасьць і баявую гатоўнасьць пралетарыяту. Разам з тым, мы маем цэлы рад выступленьняў яўрэйскіх шавіністаў, як у м. Сьвіслачы і інш. Трэба адзначыць, што вылазцы яўрэйскіх шавіністаў ня быў даны рашучы адпор з боку камсамольцаў, якія былі сьведкамі гэтых вылазак.

Адначасова, з раду месц сыгналізуюць аб антысэміцкай вылазцы. Нядаўніцкія здарэньні вылазкі клясавых ворагаў у Лепелі не зьявіліся сыгналам для паасобных арганізацый, яны не мабілізавалі мас на барацьбу з праявамі антысэмітызму, ня ўсе партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі зрабілі з гэтага належныя вывады. Не праведзена ў дастатковай ступені выхаваўчая растлумачальная работа, ня створана вакол гэтага грамадзкая думка. Абураючае ганебнае выступленьне антысэмітаў мела месца і ў Новабеліцы. Лепшага рабочага-яўрэя зьбілі хуліганы-антысэміты, зьдзекваліся над ім.

Аб чым гэта сьведчыць? Гэта сьведчыць аб тым, што яшчэ да гэтага часу прафсаюзныя арганізацыі не перабудавалі сваёй работы, што яны яшчэ працягваюць і цяпер весьці работу «па-старымцы», недаўлічваюць таго, што ў прамысловасьць уліваюцца новыя тысячы рабочых з вёскі з адсталымі поглядамі, з уласьніцкімі звычкамі, недаўлічваюць таго, што сярод новых рабочых павінна весьціся работа баявымі бальшавіцкімі тэмпамі, што перавыхаваньне іх, загартаваньне ў пралетарскім катле павінна адбывацца з большай хуткасьцю, што павінна праводзіцца культурна-выхаваўчая інтэрнацыянальная работа сапраўднымі бальшавіцкімі тэмпамі.

Бурны рост нашага сацыялістычнага будаўніцтва, ліквідацыя беспрацоўя, увядзеньне ўсеагульнага першапачатковага абавязковага навучаньня, правільнае правядзеньне нашай партыйнай ленінскай нацпалітыкі—зьяўляецца зарукай таго, што мы зьнішчым рэшткі праклятага мінулага ў найбліжэйшы гістарычны адрэзак часу. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК нашай партыі яшчэ больш узмоцнім барацьбу з апартунізмамі, правым, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, «левым» апартунізмам, бясспрынцыповым права-«лявацкім» блёкам, нацыянал-апартунізмам. Рашуча, ні на хвіліну ня спыняючы барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, з актывізуючымся контрэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з яўрэйскім шавінізмам і шавінізмамі іншых колераў, за сапраўднае ленінскае інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Толькі няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую палітыку нашай партыі, мы зможам ісьці сапраўднымі бальшавіцкімі тэмпамі наперад. І мы будзем ісьці так, каб сусьветны пралетарыят мог ганарыцца намі, як адным з ударных атрадаў і мог сказаць: «вось ён, мой перадавы атрад, вось яна, мая ўдарная брыгада, вось яна, мая рабочая ўлада, вось яна, мая бацькаўшчына,—яны робяць сваю справу, нашу справу—добра,—падтрымаем іх супроць капіталістаў і раздуем справу сусьветнай рэвалюцыі». (Сталін).

Ганебная вылазка антысэмітаў на лесазаводзе імя Халтурына

Пралетарскі суд сурова пакараў антысэмітаў

На лесазаводзе імя Халтурына ў гор. Рагачове за апошні месяц быў рад выпадкаў антысэмітызму. 30 сьнежня рабочыя гэтага заводу Хадкевіч, Бацюшкаў і Прывалаў арганізавалі зьдзекі над яўрэямі рабочымі т. т. Альшанскім і Ясеневым. Гэтыя антысэміты спачатку абражалі іх рознымі словамі і давалі ім розныя антысэміцкія мянушкі. Пасьля гэтага зрабілі крыж і прымусілі т. Альшанскага ўзяць гэты крыж у рукі і цалаваць а таксама вымазалі салам тав. Альшанскаму вусны і прымусілі яго сала зьесьці, а т. Ясеневу вымазалі галаву машынным маслам.

У час гэтых зьдзекаў над таварышамі Альшанскім і Ясеневым прысутнічала шмат рабочых, але ніхто ня даў адпору зарвайшымся антысэмітам

Бюро РК КП(б)Б, даведаўшыся аб гэтым ганебнейшым зьявішчы, тэрмінова прыняло меры. Быў склікан агульны сход рабочых, які расцаніў гэты факт як вылазку клясавага ворага і рабочая грамадзкасьць патрабавала прыцягнуць антысэмітаў да суровай адказнасьці. 9 студзеня быў наладжан паказальны працэс у Рагачоўскім судзе, на якім прысутнічалі амаль усе працоўныя гораду Рагачову.

Пасьля двухдзённага разбору гэтай справы суд вынес наступнае рашэньне: антысэмітаў Хадкевіча, Бацюшкава і Прывалава як ворагаў рабочае клясы прысудзіць на два гады папраўчага дому. Бацюшкава і Прывалава пасьля адбыцьця пакараньня пазбавіць выбарчых правоў на два гады. Прымаючы пад увагу, што Прывалаў і Бацюшкаў знаходзяцца пад судом другі раз, забараніць ім працаваць на вытворчасьці на працягу 3-х год пасьля адбыцьця пакараньня.

Прывалава, які зьвязаны з варожым элемэнтам, пасьля адбыцьця пакараньня выслаць за межы Рагачоўскага раёну на тры гады.

Гэтае рашэньне суду было адобрана ўсёй пралетарскай грамадзкасьцю г. Рагачову.

Трэба адзначыць, што гэтае здарэньне зьдзекваньня над рабочымі яўрэямі ёсьць вынік таго, што на заводзе адсутнічала палітычна-масавая работа сярод рабочых, а таксама не вялося ніякай работы па інтэрнацыянальным выхаваньні рабочых, асабліва маладых рабочых, якія нядаўна прышлі з вёскі.

Рагачоўскаму РК КП(б)Б з гэтага факту трэба зрабіць належныя палітычныя вывады і мабілізаваць усе сілы партарганізацыі на ўзмацненьне палітычна-масавай работы сярод рабочых, а таксама разгарнуць шырокую работу па інтэрнацыянальным выхаваньні і растлумачэньні нацыянальнай палітыкі партыі ня толькі сярод рабочых, але і сярод працоўных мас гораду і вёскі.

АСАКА.

Адсутнічае інтэрнацыянальнае выхаваньне сярод камсамольцаў

Загадчык Буда-Кашалёўскай раённай [illegible] тав. Шаціла на бюро РК ЛКСМБ выступіў супроць выпіскі беларускіх газэт. У сваёй прамове тав. Шаціла сказаў:

«Навошта нам чытаць беларускія газэты, калі ёсьць расійскія газэты, якімі можна карыстацца ў штодзённай рабоце».

Гэта выступленьне тав. Шацілы РК ЛКСМБ расцаніла як факт вылазкі вялікадзяржаўнага шавініста. Шаціла за гэта выключаны з радоў ЛКСМБ.

Трэба зазначыць, што ў Буда-Кашалёўскім раёне работа па інтэрнацыянальным выхаваньні сярод камсамольцаў пастаўлена зусім дрэнна.

РК ЛСМБ трэба зараз-жа прыступіць да разгортваньня работы па інтэрнацыянальным выхаваньні і павесьці рашучую барацьбу з усякімі адхіленьнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Граніт.

„Гаварэце мне па расійску...“

У пачатку сьнежня адбыўся сход працаўнікоў каапэрацыйных арганізацый, прысьвечаны месячніку беларусізацыі. На гэтым сходзе ініцыятыўная група па распаўсюджаньні газэты «Калгасная Праўда» прапанавала работнікам зрабіць падпіску на гэтую газэту. Аднак, гэтая прапанова аб падпісцы на беларускую газэту абурыла справавода калгассаюзу Васілёву, якая сказала: «гэта газэта ваша і мова ваша, выпісвай газэту ня буду».

На гэтым-жа сходзе была абрана камісія, якая і занялася разглядам вылазкі вялікадзяржаўнай шавіністкі—Васілёвай. Калі камісія зьявілася ў Райкалгассаюз да Васілёвай для таго, каб запытаць яе, дык яна сустрэла так: «чаму вы так абараняеце сваю мову». а пасьля прапанавала—«гаварэце да мяне па расійску, бо я па беларуску не разумею».

Праз некалькі дзён выніку работы гэтай камісіі былі пастаўлены на абгаварэньне агульнага сходу работнікаў каапэрацыйных арганізацый. Сход кваліфікаваў адносіны Васілёвай да беларускай мовы, а таксама да камісіі, як праяву вялікадзяржаўнага шавінізму.

На гэтым-жа сходзе Васілёва знайшла сабе абаронцаў агранома Дзіняшкевіча і тав. Васільева.

Пасьля разгляду гэтай справы камісіяй была прапанавана рэзалюцыя, якая асуджала ўчынак Васілёвай, як праяву вялікадзяржаўнага шавінізму. Але агульны сход гэту рэзалюцыю адхіліў большасьцю галасоў.

Галасаваньне паказала, што вялікадзяржаўных настрояў ва ўстановах Лепельшчыны мацуца досыць многа. Райкому КП(б)Б і прафарганізацыям трэба прыняць рашучыя меры да зьнішчэньня гэтага зьявішча.

«Лепельскі».

„Пачакайце, часу хопіць...“

У лютым месяцы 1930 г. ячэйка КП(б)Б пры Навазыбкаўскім рабкопе абвясьціла сябе ўдарнай па вывучэньні беларускай мовы. Але ў гэтай ячэйцы знайшліся такія таварышы, якія ня імкнуліся да вывучэньня беларускай мовы. Асабліва варожа аднёсься да беларускай мовы тав. Босін, якога нацкамісія пры РВК ужо тры разы выклікала для таго, каб выявіць ступень ужываньня ім беларускай мовы. Босін ніводнага разу не зьявіўся на выклік камісіі, а таксама ніводнага разу не наведаў гурток беларускай мовы.

Тав. Босін на агульных сходах, як партыйных, так і іншых выступае выключна на расійскай мове і калі хто адважваўся заўважыць яму на гэта, дык ён са злосьцю адказваў,—«пачакайце, часу хопіць, яшчэ навучуся». Тав. Босін заўсёды высьмейвае тых таварышоў, якія да яго зварочваюцца па беларуску. Партыйная ячэйка да вылазак вялікадзяржаўнага шавініста Босіна ніякіх мер ня прымала і адносілася яўна прыміркенча.

Усоўскі.

Шавіністы не атрымалі рашучага адпору

На Сьвіслацкай сцэне была дана драмгурткам пастаноўка «Чудак». З гэтай пастаноўкі дана толькі першая частка, у якой яскрава адбываецца нацыянальная зваднка на савецкіх фабрыках і заводах. У гэтай частцы «нашыя артысты» тэндэнцыйна паказалі тых членаў партыі, жапаработнікаў і камсамольцаў, што ўдзельнічалі ў зьдзеках над яўрэйкай работніцай, якая называлася ня інакш як ганебным словам. У канцы п'есы яны далі малюнак, як рабочыя заводу ўтапілі гэтую работніцу, а тых рабочых, якія спрабавалі стаць на абарону яўрэйкі-работніцы, зьнялі з работы.

Рэжысура гэтай пастаноўкі ні ў пачатку, ні ў канцы вечару не дала ніякага тлумачэньня. Таму на гледачоў было зроблена дрэннае ўражаньне, а яўрэйскія нацыяналістычна-крымінальныя элемэнты мястэчка гэтай вылазкай шавіністых былі вельмі здаволены.

Ня дзіва, што гэта магло здарыцца, бо ў гэтым драмгуртку ўдзельнічаюць такія пэрсаналы: Марчок С. (дачка рабіна), Марон С. (сын былога гандляра), Шышкавец Ю., Сьміронік К. і іншыя мястачковыя мяшчане, як я пічога супольнага з рабочай моладзьдзю ня маюць.

Цікава адзначыць, што на гэтым вечары прысутнічаў прадстаўнік РК ЛКСМБ і гэтай нахабнай вылазцы клясавага ворага не даў адпаведнага адпору. Наогул на гэты факт ніхто не рэагаваў да гэтага часу.

Трэба каму сьлед заняцца гэтай справай.

Юнкоры: Баршай, Шапіра і Оучнік.

Месячнік беларусізацыі праведзены

У Менскім дзяржаўным архітэктурным тэхнікуме ў час правядзеньня месячніка беларусізацыі выявілася, што 42 настаўнікі дзённага і вячэрняга тэхнікуму выкладаюць даручаныя ім дысцыпліны на расійскай мове. На чацьвертым курсе дарожнага тэхнікуму выкладаньне праводзіцца выключна на расійскай мове. Студэнты апошніх курсаў тэхнікуму адмаўляюцца вывучаць беларускую мову і тлумачаць тым, што няма на гэта часу. На другім і трэцім курсе архітэктурнага тэхнікуму беларуская мова ўжываецца толькі на 35 проц. Некаторыя студэнты архітэктурнага тэхнікуму разважаюць так: «Калі мы ня будзем ведаць беларускай мовы і нацпалітыкі, дык ад гэтага будынак не разваліцца».

Таксама ў час месячніка выяўлена, што студэнцтва беларускіх газэт ня выпісвае, бібліятэка не ачышчана ад школьнай нацдэмаўскай літаратуры, мастацкая літаратура на мовах нацменшасьцяй ня выпісваецца. Пастановы каспрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б па нацпытаньні на партыйных, камсамольскіх і студэнцкіх сходах не распрацоўваліся.

Правядзеньне месячніка беларусізацыі адміністрацыя тэхнікуму адзначыла загадам аб абавязковым ужываньні белмовы, не правёўшы папярэдняй растлумачальнай работы па нацпалітыцы партыі. Таксама ў адміністрацыйным парадку быў складзен гурток вывучэньня белмовы, куды запісалася 65 асоб са складу настаўнікаў, а фактычна наведвала гэты гурток 9 чалавек і то не сыстэматычна.

Трэба з усёй рашучасьцю адзначыць, што месячнік беларусізацыі ў архітэктурным тэхнікуме змазаны. Ня была мабілізавана партыйная і студэнцкая грамадзкасьць на рашучае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі. Ня было дана рашучага адпору праявам вялікадзяржаўнага шавінізму як з боку настаўнікаў, так і паасобных студэнтаў.

Ячэйцы КП(б)Б архітэктурнага тэхнікуму неабходна зараз-жа прыступіць да падагуленьня вынікаў праведзенай работы па беларусізацыі, а таксама шырэй разгарнуць работу сярод студэнцтва па вывучэньні нацыянальнай палітыкі партыі, мабілізаваць партыйныя і студэнцкія масы на барацьбу з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму і антысэмітызму ў сьценах тэхнікуму.

А. М.

Няма месца антысэмітам у радох пралетарскага студэнцтва

Ня раз цісалася ў газэтах аб вылазках антысэмітаў у Менскім музтэхнікуме. Але ні партыйная, ні камсамольская ячэйкі, ні прафком, ні адміністрацыя на вылазкі клясавага ворага не рэагуюць і антысэміты застаюцца не пакаранымі.

Нядаўна ў Музтэхнікуме была вылазка антысэміта - студэнта Самсона, які кожны дзень тым ці іншым словам ображае студэнтаў яўрэяў. Некалькі дзён таму назад справа антысэміта Самсона разглядалася на прафкоме і прафком, ня даўшы ніякай палітычнай ацэнцы гэтай справе, перадаў яе на разгляд таварыскага суду. Таварыскі суд таксама прымірэнча аднёсься да антысэміта, ня даў адпаведнай палітычнай ацэнцы антысэміцкай вылазцы Самсона. Студэнцкая грамадзкасьць не мабілізавана на барацьбу в выпадамі варожых элемэнтаў. Самсону вынесена толькі вымова, на якую ён нават не рэагаваў, і працягвае сваю варожую палітыку.

Партарганізацыі, прафкому і адміністрацыі неабходна зараз-жа пераглядзець справу Самсона і пазбавіць тэхнікум ад антысэміта.

Г. Ліўшыц.

Пад знакам падрыхтоўкі да зьезду саветаў

Бядняцка-серадняцкае насельніцтва Броскага сельсавету, Бабруйскага раёну, у парадку падрыхтоўкі да сяўбы высунула свой сустрэчны плян засеву, які на 8,6 проц. перавышае наметку РВК. Шэраг вёсак калектывізавана на 100 проц. У сувязі з Ленінскімі днямі ў калгасы сельсавету ўлілося некалькі дзесяткаў новых гаспадарак. Падрыхтоўка да сяўбы ідзе па-баявому, па-ўдарнаму, ідзе пад знакам рапортаваньня зьезду саветаў аб калектывізацыі. Гэтыя дасягненьні Броскі сельсавет мае дзякуючы сваёй актыўнай работе, дзякуючы бязупыннай барацьбе з варожымі элемэнтамі і апартуністычнай стаўкай на самацёк. Па Броскаму сельсавету павінны раўняцца іншыя сельсаветы Бабруйшчыны.

Д. Аланскі.

„Палітыка калючага дроту“— ЗЬВЯНО У ПАДРЫХТОЎЦЫ АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ

„Ротэ Фанэ“ аб гандлёвых узаемаадносінах СССР з Нямеччынай

„Эканамічны крызіс у Нямеччыне быў-бы яшчэ глыбей, а беспрацоўе яшчэ большае, калі-б краіна пераможнага сацыялізму не давала нямецкім працоўным хлеба і работы, якіх капіталістычная Нямеччына ім больш даваць ужоня можа“

БЭРЛІН. 8-II. «Ротэ Фанэ», друкуе сёньня лічбовыя даныя аб савецкіх заказах, разьмешчаных у Нямеччыне.

Раўнаючы суму савецкіх закажаў за першыя тыдні студзеня 1931 году з адпаведнай сумай 1930 г., «Ротэ Фанэ» заяўляе: «гэтых нямногіх даных досыць, каб паказаць надзвычайнае значэньне, якое мае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР для працоўных Нямеччыны. Эканамічны крызіс у Нямеччыне быў-бы яшчэ глыбей, а беспрацоўе яшчэ большае, калі-б краіна пераможнага сацыялізму не давала-б нямецкім працоўным хлеба і работы, якіх капіталістычная Нямеччына ім больш даваць ужо ня можа. Бясспрэчным фактам зьяўляецца тое, што вядзеньне спраў з СССР становіць для капіталістычнай Нямеччыны вядомыя выгады, што аднак не перашкаджае нямецкім прадпрыемцам весьці ў куплеванай ім прэсе бесспрэчна цікавае СССР, скарыстоўваючы для гэтага так званы «дэмпінг». Ніякай яны вядуць цікаваньне. Яны тым самым толькі дрэнна ўтойваюць свой панічны страх перад далейшым разьвіцьцём іх сьмяротнага крызісу ў той час, як краіне бальшавізму, якой тысячы разоў прарочылі «страх», належыць будучыня. Аб гэтым гаворыць сьмелая і прасякнутая ўпэўненасьцю ў перамозе прамова тав. Сталіна на зьезьдзе працаўнікоў прамысловасьці. Гэтую прамову мы сёньня друкуем поўнасьцю. Яна зьяўляецца гістарычным дакументам, які мае надзвычайнае значэньне і для нашай барацьбы. Нямецкі рабочы павінен уявіць сабе, што нават буйнейшыя савецкія заказы Нямеччыне ня могуць даць рашучай зьмены ўсяго становішча. Не бальшавіцкія заказы нямецкім капіталістам, а толькі бальшавіцкія ідэі, ператвораныя ў масавую сілу пад кіраўніцтвам кампартыі Нямеччыны павядуць рабочых на барацьбу супроць эксплёататараў і адчыняць ім вароты ў сацыялізм».

За ўстанаўленьне дыплёматычных адносін ПАЗШ з СССР

НЬЮ-ЁРК, 7. Джон Басет Мур—вядомы амэрыканскі юрыст-спэцыяліст лідэр правых, выступіў 4 сьнежня 1930 году ў Нью-Ёрскай асацыяцыі юрыстаў з прамовай, у якой рэзка крытыкаваў замежную палітыку ПАЗШ. Прамова Мура, які займаў на працягу 1921—28 году пост судзьдзі ў міжнародным гігацкім трыбунале, выклікала ў ПАЗШ вялікую зацікаўленасьць і вельмі занепакоіла вышынгтонскія афіцыйныя колы. Год таму назад амэрыканскаму народу нечакана напомнілі аб тым факце, што столькі часу ня маем дыплёматычных адносін з Расіяй. Непасрэднай прычынай таму паслужыла прапанова, зробленая нашым урадам Савецкаму ўраду, пры дапамозе трэцяга боку якая складалася з парады мірна вырашыць канфлікт з Кітаем. Мы заключылі ўсенародную згоду, якая звычайна называецца пактам Келёга да якога савецкі ўрад па хадайніцтву аднаго з удзельнікаў гэтай згоды з нашага поўнага веданьня і згоды, далучыўся. Гэтым актам мы няўхільна прызналі савецкі ўрад, бо па азбуцы міжнароднага права і дыплёматы, прызнаньне магло быць, як пад падразумяваючым ся, так і проста выражаным, прычым адным з усім вядомых прыкладаў падразумяваемага прызнаньня зьяўляецца ўваходжаньне ў дагаворныя зносіны. Мур далей адзначыў: у інструкцыі, якую Джэфэрсон у якасьці міністра замежных спраў даў нашаму пасланьніку ў Францыі губэрнатару Морысу ў 1793 годзе гаворыцца: мы бязумоўна ня можам адмаўляць за якім-небудзь народам гэтага права, на якім створан уласны ўрад, а іменна, што кожны можа кіраваць сабой па свайму жаданьню.

Мур далей заявіў, што Злучаныя Штаты адмовіліся ад гэтага правіла ў 1913 годзе з прычыны варожасьці прэзыдэнта Вільсона да Мэксыканскага ўраду, на чале якога стаяў прэзыдэнт Хуэрт. Вісон не пажадаў прызнаць Хуэрта. Ёсьць наступнае месца: мы зьяўляемся таварышамі міру: у якасьці апошніх мы таму павінны аддавацца перавагу тым, якія дзейнічаюць у інтарэсах міру і гонару, якія абараняюць прыватныя правы і паважаюць канстытуцыйныя формы. Гэтая заява—кажа далей Мур,—зьявілася радыкальным адыходам ад нашай ранейшай палітыкі і практыкі. Адыход ад ранейшай палітыкі,—кажа Мур— ня толькі прывёў нас да становішча інтэрвэнцыі ва ўнутраныя справы сярод іншых краін, але і натхнуў наш народ на недарэчнае і злоснае меркаваньне, што прызнаньне ўраду падразумявае сабой згоду з яго канстытуцыяй, эканамічнай сыстэмай з яго адносінамі да рэлігіі і агульнай лініяй паводзін. Непадобна дапушчаць, што ўрад Злучаных Штатаў хоць калі-небудзь ухваліў форму праўленьня ў тых краінах, з урадамі якіх ён падтрымліваў дыплёматычныя адносіны. Я маю на ўвазе шматлікія і ліберальныя і не ліберальныя ўрады; вольныя і ня вольныя; сумленныя і эдрадніцкія; мірныя і ваяўнічыя; імпэрыі, манархіі і алігархіі, усіх прадстаўнікоў стрыкатага сьвету, з якім мы жывём і з якім мы павінны мець справы. Распаўсюджаным заблытваньнем, меркаваньням, што прызнаньне і ўстанаўленьне дыплёматычых адносін падразумявае сабой адмову ад прэтэнзій. Нічога ня можа быць больш супярэчваючым ісьціне ,чым такое меркаваньне.

Калі міжнароднае права вызначае разрыў дыплёматычных адносін, як не таварыскі мэтад паводзін, дык аднолькава верна і тое, што захаваньне дыплёматычных адносін ня выклікае сабой адмовы ад прэтэнзій, а толькі трымае адкрытым шлях для абгаварэньня.

Цзынь-Фы — у руках чырвоных

ШАНХАЙ, 7-II. Газэта «Шэнь-Бао» паведамляе, што камуністычныя атрады занялі горад Цзынь-Фы на поўначы правінцыі Хунань. У гэты раён пасланы некалькі батальёнаў паўнічнага войска.

Палітыка „калючага дроту“ — зьвяно ў падрыхтоўцы антысавецкай вайны

ПАРЫЖ, 7-II. Закранаючы, у сувязі з прамовай тав. Сталіна, пэрспэктыв пяцігадовага пляну «Эка-дэ-Пары» заяўляе, што «нават ня поўнае ажыцьцяўленьне пяцігодкі зрабіла-б Расію небясьпечнай для эканомікі цывілізаваных народаў. Калі-б у бліжэйшую восень Расія магла кінуць на сусьветны рынкі павялічаную колькасьць хлеба, лёну, леса і жалезнай руды, то гэтага было-б дастаткова, каб сусьветны эканамічны крызіс прыняў трагічны зварот».

Заяўляючы, што саветы можна параўнаць з «біржавымі піракамі на зьніжэньне», Эка-дэ-Пары» адзіным сродкам абароны супроць СССР лічыць «тую палітыку, якую 10 год таму назад называлі палітыкай «калючага дроту, г. зн. блёкады». Пэртынакс хацеў-бы каб першыя крокі ў гэтым напрамку былі зроблены Францыяй і Англіяй. «Тан», зьмяшчаючы выняткі з прамовы т. Сталіна, устрымліваецца ад камэнтараў.

Супроць белага тэрору

НЬЮ-ЁРК, 5. Як паведамляюць з Гаваны (Куба), усеапульная забастоўка пратэсту супроць белага тэрору і адмены канстытуцыі, як меркавалася, працягвалася 24 гадзіны.

Беспрацоў'е ў Польшчы расьце

ВАРШАВА. 4-II. Паводле агалошаных тэтымі днямі данных, лік беспрацоўных на 31 студзеня дасягнуў 341.182 чал. На працягу аднаго тыдню засталося без работы 10.000 чал.

Да X Усебеларускага Зьезду Саветаў

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанавіў склікаць X Усебеларускі Зьезд Саветаў 20 лютага 1931 году ў гор. Менску.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Справаздача Ўраду БССР.
2. Даклад Наркамзему аб саўгасным і калгасным будаўніцтве.
3. Даклад Вышэйшага Савету Народнае гаспадаркі БССР.
4. Даклад Народнага Камісарыяту Асьветы БССР.
5. Выбары:

а) Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР;
б) Членаў савету нацыянальнасьцяй ЦВК Саюзу ССР;
в) Дэлегатаў на Усесаюзны зьезд саветаў.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Двухдэкадным штурмам лёназагатовак спатхаем X усебелар ск зъезд саветаў

Арганізуем чырвоныя абозы імя зьезду саветаў

У двухдэкаднік штурму ліквідаваць пр рывы

На 5-е лютага гадавы плян загатоўлі лёнавалакна па БССР выканан на 27,3 проц. даўшы павялічэньне за пяцідзёнку толькі на 1,2 проц. Лёнагемя за гэтую-ж пяцідзёнку загатоўлена 1 проц., што складае разам з папярэднім выкананьнем—54,2 проц. гадавога заданьня. Канапель за ўвесь час загатавана 53,4 проц. і пяньки—8,9 пр. гадавога заданьня.

З 5-га лютага праводзіцца двухдэкадник штурму лёназагатовак. Загатоўчыя і ўсе іншыя раённыя арганізацыі павінны пераключацца на баявыя тэмпы загатовак з тым, каб у часе двухдэкадніка поўнасьцю выканаць заданьне.

Г. Ш.

Дабіцца пералому

Раёны жывёлагадоўчага напрамку стаяць на апошнім месцы, па выкананьні пляну загатовак лёнавалакна.

Гэтыя раёны выканалі сваё заданьне толькі на 12,2 проц., пляну у той час, як лёнаводныя раёны выканалі заданьне на 33,8 проц. і садова-гародныя на 15,7 проц.

Гэта сьведчыць аб тым, што райкааплёнсаюзы зусім ня аддаюць увагі загатоўкам і спадзяюцца на самацёк. У студзені месяцы замест павялічэньня загатовак, маецца вясупыннае зьніжэньне: за апошнюю пяцідзёнку сабрана толькі палова загатоўкі першай пяцідзёнкі.

Збор закантрактованай прадукцыі ад аднаасобнікаў праходзіць па ўсіх раёнах надзвычайна дрэнна, хоць усе тэрміны спагнаньня закантрактованай прадукцыі ўжо мінулі.

Вучоту цьвёрдых заданьняў, дадзеных кулацка-заможным гаспадаркам няма. Ніводзін Райкаапсаюз да гэтага часу ня прыслаў зьвестак аб давядзеньні сельсаветамі цьвёрдых заданьняў да кулацкага двара.

Гэта ганебнае становішча з загатоўкамі лёну ў раёнах жывёлагадоўчага напрамку сьведчыць, што вакол загатовак ня была мабілізавана грамадзкасьць, ня было клясавага падыходу, Райкаапжы і саюзы разам з мясцовымі арганізацыямі не аддалі належнай увагі загатоўкам.

Журомскі.

Ударыць па права-„левацкай“ практыцы

бярэзінскіх апартуністаў

У Бярэзінскім раёне ў справе загатовак дапушчаны «левацкія» перагібы ў адносінах да серадняка і апартуністычныя скрыўленьні лініі партыі ў дачыненьні да кулака. Многім серадняком дадзены цьвёрдыя заданьні ў той час, як значная колькасьць кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдых заданьняў не атрымала. На хутарох Аўгустова і Ізьбішча дадзены цьвёрдыя заданьні 12 серадняцкім гаспадаркам Серадняку Бурымскаму далі цьвёрдае заданьне здаць 3 пуды кароўята масла і 3 пуды сьвінога сала, у той час, калі ён мае адну карову, адну сьвінню і адну авечку. Між тым, на гэтых-жа хутарох маюцца кулацка-заможныя гаспадаркі, якім цьвёрдыя заданьні зусім ня дадзены.

У вёсцы Князёўка, Бялічанскага сельсавету, серадняку Бандарчуку Міхасю сельсавет даў цьвёрдае заданьне—здаць адну карову ў той час, калі на 7 душ у гэтага серадняка маецца толькі дзьве каровы. У гэтай-жа вёсцы кулацка - заможныя гаспадаркі цьвёрдых заданьняў не атрымалі. Аналёгічная зьявішча маюць месца па раду вёсак іншых сельсаветаў.

Прадстаўнік РВК Якімовіч, прыехаўшы ў Мачальскі сельсавет, даў такі загад:

«Ніякіх заяў па загатоўках ад сялян ня прымаць».

Сельсавет прымушан быў падначаліцца «начальству», пакуль іншыя прадстаўнікі не растлумачылі, што так рабіць нельга.

Такім чынам, мы бачым, што ў справе перагібаў у адносінах да серадняка ў Бярэзінскім раёне вінаваты ня толькі сельсаветы, але і раённае кіраўніцтва.

Трэба зараз-жа прыняць самыя рашучыя меры да зьнішчэньня правасцвацкага апартуністаму, трэба рашуча націскуць на кулака, які не атрымаў яшчэ цьвёрдых заданьняў, выправіць перагібы ў дачыненьні да серадняка.

А. К.

Бабруйшчына ня ўключылася ў штурм загатовак лёну

(Ад нашага бабруўскага карэспандэнта).

Двухдэкадны штурм загатовак лёну мала турбуе загатоўчыя арганізацыі Бабруйскага раёну. Аб чарапашых тэмпах, якія маюць месца ў Бабруйскім раёне гавораць лічбы выкананьня пляну загатовак лёну на 5 лютага бягучага году: па спажывецкім таварыстве выкананьне пляну дасягае 55 проц., а па райкаапсаюзе—41 проц. Характарным зьяўляецца той факт, што за апошнюю пяцідзёнку паступленьня лёну амаль зусім няма. Загатоўчыя арганізацыі ня гледзячы на шэраг катэгарычных дырэктыў аб разгортваньні загатовак лёну, не пераключылі сваёй работы на ўдарныя тэмпы. Загатоўчыя арганізацыі ня ведаюць як даведзены на мясцох цьвёрдыя заданьні па загатоўках лёну да заможна-кулацкага двара. Ніхто не вядзе вучоту выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацкімі дварамі. Паступленьне лёнавалакна па кантрактацыі надзвычайна слабае. Супроць асоб, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па кантрактацыйных дагаворах ня прымаюцца ніякія меры.

Сярод асобных працаўнікоў загатоўчых арганізацый раёну існуе шкодная думка аб тым, нібыта заданьне па ільне для раёну дадзена вельмі вялікае і яно будзе перагледжана ў бок памяншэньня. Гэтыя неабгрунтаваныя меркаваньні зьяўляюцца прычынай зьніжэньня тэмпаў загатовак.

Шэраг калгасаў не здалі лёну дзяржаве, а разьмеркавалі яго паміж калгасьнікамі для забесьпячэньня сваіх асабістых патрэб.

Супроць такой злачыннай няўважлівасьці да важнейшага мерапрыемства партыі і ўраду павінны быць прыняты рашучыя меры. Стаўка на самацёк, на зьмяншэньне плянавых заданьняў павінна быць рашучым чынам зьнішчана. Загатоўкі лёну трэба перавесьці на ўдарныя тэмпы.

Д. Аланскі.

Выканаць баявы загад

Савет Народных Камісараў БССР, адзначаючы невыкананьне дырэктыў СНК і Экана аб фарсіраваньні будаўніцтва Боркавіцкага лёнзаводу, абавязаў Белбудаб'яднаньне скончыць пабудаваньне Боркавіцкага заводу да 30 мая. Разам з тым Шклоўскі лёназавод павінен быць пабудаваны да 30-га красавіка. Будаўнічымі матар'яламі абодвы заводы забясьпечваюцца ў цэнтралізаваным парадку, а ўпаўнаважаны НК Шляхоў пры СНК БССР абавязан забясьпечыць падачу вагонаў для перавозкі будаўнічых матар'ялаў.

УЗЬНЯЦЬ РОЛЮ САВЕТАЎ

у барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва

„У сучасных умовах ня можа быць месца правым апартуністам і бяспрынцыповым прымірэнцам у кіруючых органах саветаў“

(З пастан. сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Пугляеўскі сельсавет не перабудаваў сваёй работы

Пугляеўскі сельсавет—самы адсталы на Аршаншчыне. У справе выкананьня дырэктыў партыі і савецкай улады на вёсцы, Пугляеўскі сельсавет цягнецца ў хвасьце. Сельска-гаспадарчы падатак спагнаны толькі на 82 проц., страхоўка—на 74 проц. і самаабкладаньне—на 69 проц. Заданьні па загатоўках ільнанасеньня выкананы на 61 проц., па ільнавалакне—на 20 проц., па сене—на 64 проц. і па саломе яшчэ менш. Таксама праходзяць слаба і мясазагатоўкі, а заданьні па загатоўцы пянькі, насеньня вікі, канюшыны, лубіну і гародніны—зусім ня выкананы. Таксама недавыканана заданьне і па хлебазагатоўках.

Тлумачыцца такое становішча галоўным чынам тым, што з боку старога сельсавету ня было ніякага націску на кулака. З прычыны адсутнасьці націску на заможна-кулацкія элемэнты вёскі, многія заможныя цьвёрдыя заданьні па загатоўках ня выканалі, і свае лішкі разбазарылі Заможнік Балабаў (в. Лявонаўка) павінен быў здаць па цьвёрдым заданьні 3.5 тоны сена, але ён сена разбазарыў.

Да апошняга часу па Пугляеўскім сельсавеце « ня было» кулакоў, іх знайшлося 11 толькі тады, калі ў сельсавет выехалі прадстаўнікі з раёну, якія таксама ня выявілі ўсіх кулакоў. У в. Лявонаўка яшчэ засталіся кулакі-спэкулянты (Старыковы і Жуладавы), якія не абкладзены індывідуальным с.-г. падаткам. Неабкладзеныя маюцца і ў іншых вёсках сельсавету. Між тым, як серадняка Далідовіча Рыгора з в. Кушэўкі абклалі індывідуальна толькі таму, што ён прымушан быў перабудоўвацца два разы (ён перасяляўся) і наймаў для гэтага рабочых, бо сваёй сілы ў яго не хапала.

Адсутнасьць націску на заможна кулацкія элемэнты вёскі з боку сельсавету дала магчымасьць кулакам пралазіць у калгасы і займаць там кіруючыя пасады.

У калгасе «Юны Тварэц» старшыня калгасу быў кулак Пліпповіч. Калгас, маючы ўсе даныя для свайго пашырэньня за кошт вакольнага бядняцка-серадняцкага сялянства, увесь час падарчыў арганізацыі і асобныя прадпрыемствы, якія не зразумелі ўсёй важнасьці гэтай справы і якія ня ўсім ахвотна, а ў некаторых выпадках нават, можна сказаць, злачынна адносяцца да практыкантаў, пасланых на вытворчасьць. Напрыклад, адзін завод заявіў студэнтам індустрыяльнага тэхнікуму: «Вы, рабіты, калі хочаце, можаце прыходзіць на завод, глядзець, як мы працуем, мы будзем выплачваць паложаную практыкантам заработную плату, але ня лезьце ў вытворчасьць, не перашкаджайце нам працаваць».

Справа з вытворчай практыкай цяпер ужо наладжваецца, уводзіцца вызначаная сыстэма правядзеньня практыкі. Па лініі гаспадарчых арганізацый прыняты адпаведныя меры да аказаньня садзейнічаньня навучальным установам у правядзеньні вытворчай практыкі.

Калі больш-менш наладжваецца пытаньне палітэхнізацыі прафэсыянальна-тэхнічных навучальных устаноў, дык па палітэхнізацыі масавай школы маюцца яшчэ толькі спробы, паасобныя крокі. Тут яшчэ няма большэтычная кампанія ня выканана як належыць быць.

Як і раней новы склад сельсавету цягнецца ў хвасьце, як і раней ён не павярнуўся тварам да калгасаў, не арганізаваў прыліў у калгасы. Як і раней, у сельсавеце нічога ня робіцца ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што сельсавет ня мае вакол сябе і актыву з ліку перадавікоў калгасьнікаў, сялян-беднаты і сераднякоў.

Сельсавет ня мае таксама дастатковай дапамогі і кіраўніцтва з боку Райвыканкому. Толькі паток папер і абежнікаў ляціць у сельсавет, а жывога кіраўніцтва няма, між тым сельсавет зараз, як ніколі мае патрэбу ў дапамозе.

Райвыканком і раённая партыйная арганізацыя павінны дапамагчы сельсавету перабудаваць работу, каб ён сапраўды стаў правадніком дырэктыў партыі і ўраду на вёсцы.

А. Кудрын.

Аршанскі раён.

Калгасьнікі—дэлегаты раённага зьезду Саветаў Аршанчыны, за тутаркай.

Савецкае будаўніцтва

ТРЫБУНА прапаноў за X-ы усебеларускага зьезд саветаў

19 т. Гольдберг

БЮРО ФІЗКУЛЬТУРЫ ПРЫ ЦСПСБ

32. Прапаную арганізаваць у Менску цэнтральны дом фізычнай культуры.

20 т. Фёдараў

СУПРАЦОЎНІК ЦСПСБ

33. Неабходна арганізаваць па БССР рад перасовачных майстэрняў па рамонту радыё-ўстановак.

21 т. Галаўчынер

МАСТАЦКІ КІРАЎНІК РАБОЧАГА ТЭАТРУ ПРЫ ЦСПСБ.

34. Трэба арганізаваць дом самадзейнага мастацтва, які-б потым ператварыўся ў цэнтральную кансультацыю для ўсіх самадзейных гурткоў БССР і які спрыяў-бы шырокаму разьвіцьцю вандроўных тэатраў.

22 т. Вярнікоўскі С.

ПАДСОЧНІК ЛЕСАПРАМГАСУ

35. Прымаючы пад увагу, што падсочка хвоі ў БССР—справа новая, а здабыча жывіцы неабходна для падняцьця прамысловасьці і каштоўная ў сэнсе эксплёатацыі драўніны, бо пры правільнай пастаноўцы падсочнай справы хвоя можа даць смалы-жывіцы амаль на аднолькавую каштоўнасьць з каштоўнасьцю самога дрэва, —неабходна:

а) Адкрываць (падсочныя) лесагасьмічныя курсы па падрыхтоўцы кадраў два разы ў год;

б) У 1932 годзе ахапіць падсочкай увесь сасновы дрэвастан, які ідзе ў высечку.

в) Райвыканкомам і сельсаветам на мясцох садзейнічаць справе арганізацыі падсочкі.

Пад знакам росту сацыялістычнага будаўніцтва

ВОРША, 6-II. (Наш. кар.). Пачаў работу шосты раённы зьезд саветаў Аршанчыны. Гэты зьезд праходзіць пад знакам росту сацыялістычнага будаўніцтва ў раёне.

У галіне прамысловасьці ёсьць павялічэньне валавой прадукцыі па мясцовай—на 57 проц. і па рэспубліканскай —на 46 проц. Колькасьць рабочых узрасла на 44 проц. Сабекошт зьнізіўся—на 62 проц., пры значным палепшаньні якасьці прадукцыі. Разам з гэтым павялічыліся ў значнай колькасьці і ўкладаньні ў прамысловасьць па пераабсталяваньні і г. д.

Зараз раён калектывізаваны на 20 проц., замест 2.5 проц. на 1-е кастрычніка 1928 г. Зроблены таксама паварот у бок спэцыялізацыі раёну ў напрамку разьвіцьця жывёлагадоўлі, садоўніцтва і гароднінтва.

Гэтых значных посьпехаў саветы Аршанчыны дабіліся дзякуючы правільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, рашучай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі.

Аднак разам са значнымі посьпехамі маюцца яшчэ і недахопы. Да гэтага часу яшчэ ня ўсе саветы павярнуліся тварам да калгаснага руху, недастаткова аддана ўвагі стварэньню кармавой базы ў справе разьвіцьця жывёлагадоўлі, слаба яшчэ разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны, разгортваньне калгаснага руху і выкарчоўваньне рэшткаў капіталізму ў горадзе і на вёсцы—у цэнтры ўвагі раённага зьезду саветаў.

Зьезд паслаў прывітаньні ЦК УсеКП(б), ЦВК СССР, ЦК КП(б)Б, ЦВК БССР і К. Я. Варашылаву ў адзнаку яго пяцідзесяцігадовага юбілею.

Не працаваць па старынцы

Па Рудзенскім сельсавеце да перавыбарча-справаздачнай кампаніі групы беднаты былі не арганізаваны і сельсавет ня меў ніякай сувязі з беднатой, а таму ўсе палітычна-гаспадарчыя кампаніі праходзілі без актыўнага ўдзелу ў правядзеньні іх з боку беднаты. Але-ж і абраны новы склад сельсавету не паклапаціўся над пытаньнем утварэньня груп беднаты, якіх і па сёньняшні дзень у сельсавеце няма.

Рудзенскі сельсавет павінен зараз-жа ўзяцца за ўтварэньне груп беднаты і арганізацыю сыстэматычнай, плянавай работы як з беднатой так, і сярод жанчын.

Лічуха Д.

Сьмілавіцкі раён.

9-га лютага а 19-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні кіно „Культура“ адбудзецца

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ АБВШ

па выпадку 10-годзьдзя яе існаваньня

з удзелам ЦК КП б)Б., Прэзыдыуму ЦВК, партыйных, прафсаюзных і КСМ арганізацый.

Уваход па запрашальных білетах.

Да X зьезду Саветаў БССР

Пераможны рух культурнай рэвалюцыі

За ўвесь час свайго існаваньня БССР атрымала вялізарныя дасягненьні на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Гэтыя дасягненьні атрыманы, дзякуючы Кастрычнікавай рэвалюцыі, дзякуючы правільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы вялізарнейшаму рэвалюцыйнаму, творчаму энтузіязму рабочае клясы, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі. Гэтыя посьпехі атрыманы ва ўмовах шырокага сацыялістычнага наступленьня рабочае клясы, бязьлітэчай барацьбы з клясава-варожымі элемэнтамі, з контр-рэвалюцыйнымі беларускімі нацыянал-дэмакратамі, якія рыхтавалі глебу для інтэрвэнцыі, для рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне. Аб тым, што БССР атрымала вялізарныя дасягненьні ў галіне культурнага будаўніцтва, сьведчаць самі факты. Для правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня зацьверджана Саюзным Урадам дапамога БССР ў суме 52.000.000 руб. да канца пяцігодкі. Апрача гэтага, шэраг аб'ектаў капітальнага будаўніцтва як у прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, так і па культурным будаўніцтве таксама субсыдыраваліся з агульна-саюзных сродкаў. Унівэрсытэцкі гарадок каштоўнасьцю каля 10.000.000 руб. таксама будаваўся за агульна-саюзны бюджэт.

Мы маем пачатковую, сярэднюю і вышэйшую школу, друк, тэатры і інш. культасьветныя ўстановы на мовах усіх нацыянальнасьцяй. насяляючых БССР. Правільнае вырашэньне нацыянальнай палітыкі на практыцы мае вялізарнае значэньне ў справе пасьпяховага сацыялістычнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. КП(б)Б і пад яе кіраўніцтвам уся рабочая кляса БССР правялі вялізарнейшую працу па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Пытаньне барацьбы за правільнае правядзеньне нацыянальнай палітыкі асабліва завастрылася ў апошнія часы, у зьвязку з актывізацыяй, як вялікарасійскага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, так і контррэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, а таксама і шавінізмаў розных нацыянальнасьцяй.

Пасьля гэтых агульных заўваг, пераходжу да асноўнай тэмы гэтага артыкулу, менавіта да пытаньняў усеагульнага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці, і палітэхнізацыі школы, якія зьяўляюцца баявымі вучасткамі культурнай рэвалюцыі.

За ўсеагульную пісьменнасьць

Паводле дэмаграфічнага перапісу 1926 г. у БССР у сярэднім налічваецца няпісьменных 59,9 проц., а сягод жанчын--72,2 проц. Такім чынам, яшчэ ў 1926 г., дзякуючы цяжкай спадчыне праклятага царскага, ладу мы мелі ў БССР больш паловы няпісьменнага насельніцтва, г. зн. з 5 млн. чалавек--няпісьменных было 2.956.759 чалавек.

Плянавая работа па ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР пачалася ў 1923-24 г., калі быў складзены 15 гадовы плян ліквідацыі няпісьменнасьці. Пазьней гэты плян быў скарочан да 10 год. Пасьля XV зьезду партыі, на якім з усёй рашучасьцю было пастаўлена пытаньне аб немагчымасьці пасьпяхова будаваць сацыялізм пры такой вялізарнай няпісьменнасьці працоўных мас, і, калі быў высунут лёзунг культурнай рэвалюцыі,—справа ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, атрымала больш шырокі размах, стала праводзіцца больш хуткімі тэмпамі

У палове 1930 г. пастановай СНК БССР уведзена абавязковая ліквідацыя няпісьменнасьці працоўных БССР да 45 гадовага ўзросту. Такім чынам у справе ліквідацыі няпісьменнасьці 1930 г. зьяўляўся самым адказным годам.

Для пацьвярджэньня тато, наколькі шпаркімі тэмпамі разгортваецца ліквідацыя няпісьменнасьці, можна падаць наступныя лічбы. Ліквідавана няпісьменнасьць сярод працоўных: у 1924-25 г. 37.046 чал.; у 1926-27 70.073 чал.; ў 1928-29 г. 117.549 чал.; ў 1929-30 г. 225.470 чал. Намечана па пляну ліквідаваць няпісьменнасьць у 1930-31 г. 477.848 ч.

Такім чынам, з гэтых даных відаць, што ў 1930 г. неабходна было навучыць пісьменнасьці прыкладна столькі асоб, колькі было навучана за ўсе ранейшыя 6 год. Сёлета мы павінны былі ў асноўным закончыць ліквідацыю няпісьменнасьці да 45 год. Калі гэта задача будзе вырашана, тады на будучы год застанецца яшчэ 140 тыс. чалавек няпісьменных.

Дэкрэт ураду прадугледжвае прыцягненьне да справы ліквідацыі няпісьменнасьці пісьменнага насельніцтва ў абавязковым парадку. Зараз да гэтай справы, праўда, пакуль у добраахвотным парадку дагаворанасьці з прафэсыянальнымі і і казпэрацыйнымі арганізацыямі, прыцягнута каля 45 тыс. культармейцаў, якія ліквідуюць няпісьменасьць.

ЦК КП(б)Б, заслухаўшы даклад НКА аб ліквідацыі няпісьменасьці, даў цэлы шэраг дырэктыў адпаведным арганізацыям і органам аб узмацненьні работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Гэтыя дырэктывы падлягаюць абавязковаму неадкладнаму выкананьню.

Рашуча змагацца за ўвядзеньне ўсеагульнага навучаньня

Пытаньне аб усеагульным абавязковым навучаньні было пастаўлена яшчэ на Ўсебеларускім зьезьдзе саветаў у студзені 1924 г.

Падрыхтоўка да ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня вялася на працягу 3-х год; у выглядзе вопыту ўсеагульнае навучаньне ў 1927-28 г. было ўведзена ў акруговых гарадох, дзе была найбольш шырокая школьная сетка, у 1928-29 г. у 690 школьных раёнах БССР—таксама з найбольш шырокай сеткай школ і толькі на трэці год, г. зн. у 1929-30 г. —па ўсёй БССР.

На фронце ўсеагульнага навучаньня першы год даў значныя дасягненьні. Было ахоплена школамі дзяцей 8-мі гадовага ўзросту 91 проц., што можна лічыць цалкам здавальняючым. Калі ў мінулыя гады дзеці 8-мі гадовага ўзросту складалі ў першай групе ўсяго 30 проц., то сёлета яны ўжо складаюць 53,5 проц. З увядзеньнем абавязковасьці навучаньня мы мелі нябывала вялікі наплыў дзяцей ва ўсе наогул групы пачатковай школы. Меркавалася прыняць 32 тыс. дзяцей, было-ж прынята каля 75 тыс. Вынікам гэтага мы мелі ахват пачатковай школай дзяцей школьнага ўзросту, 8—11 год, 86,7 проц. замест 74 проц. у папярэднім годзе.

Вялізарнейшае значэньне для пасьпяховага правядзеньня першага году ўсеагульнага навучаньня мела, па першае, значнае бюджэтнае асыгнаваньне на аказаньне дапамогі дзецям беднаты, а па другое—стварэньне пры школах камітэтаў садзейнічаньня (камсоды). Па бюджэту было асыгнавана ў 1929-30 г. на аказаньне дапамогі дзецям беднаты 470 тыс. руб. замест 132 тыс. руб. у 1928-29 г.; акрамя таго сабрана камсодамі звыш 400 тыс. руб.

Шырокі размах усеагульнага навучаньня, асабліва ў 1930-31 навучальным годзе, паставіў пытаньне аб пэдагагічных кадрах. У гэтай галіне таксама ёсьць значныя дасягненьні. Зараз у нас 21 пэдагагічны тэхнікум з выпускам каля 1500 чал. у год. і ёсьць шэраг двух і аднагадзічных пэдагагічных курсаў з выпускам каля—1.000 чал. Але ўсё-ж такі забясьпечанасьць пачатковай школы настаўніка мі са спэцыяльнай пэдагагічнай падрыхтоўкай складае толькі да 35 проц. У 1930-31 навучальным годзе ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне ўжо для дзяцей (8-10) школьнага ўзросту, а таксама ўведзена абавязковае навучаньне для перарасткаў (11—15 год) таму мы сёлета маем яшчэ большыя цяжкасьці, чым мелі ў 1929-30 г.

На гэтым баявым вучастку культурнай рэвалюцыі ёсьць шмат і недахопаў. Плян па новаму будаўніцтву школ і іх рамонту і сёлета і летась надта слаба выконваўся. Тлумачыцца гэта галоўным чынам тым, што з боку Райвыканкомаў і сельскіх саветаў на школьнае будаўніцтва мала зьвярталася ўвагі. Асабліва кепская справа была з якасным зьместам падручнікаў, якімі карысталіся нашы школы. З мэтай выяўленьня сапраўднай якасьці і палітычнага зьместу падручнікаў, была праведзена ня лікая работа. У выніку чаго 54 падручнікі забаронены для карыстаньня.

Сёлета асабліва востра стаіць пытаньне з матар'яльным забясьпячэньнем вучняў. Спажывецкая каапэрацыя ў гэтай галіне культае на ўсе чатыры нагі.

Галоўны недахоп работы органаў Нарасьветы той, што яны ня ўмелі да гэтага часу мабілізаваць вакол культурнага будаўніцтва наогул і вакол правядзеньня ўсеагульнага навучаньня шырокія рабочыя і працоўныя масы. Да сучаснага моманту, апрача органаў народнае асьветы, культурным будаўніцтвам займаўся досыць ак тыўна Саюз Працаўнікоў Асьветы Рэшта прафарганізацый культурнаму будаўніцтву наогул і ў прыватнасьці ўсеагульнаму навучаньню зьвяртала вельмі мала ўвагі (а ў большасьці выпадкаў не зьвяртае і цяпер). Таксама амаль ніякага ўдзелу ў справе ўсеагульнага навучаньня ня прыймаюць каапэрацыйныя арганізацыі. На вялікі жаль, нават шэф усеагульнага навучаньня—камсамол ад агульных гутарак і вынясеньня добрых пажаданьняў не перайшоў яшчэ да справы.

Ператварыць начотніцкую школу ў школу палітэхнічную

Да 1929-30 г. наша школа ў БССР амаль выключна была славянскай школай, школай начотніцкай. Нават вышэйшыя і сярэднія прафэсыянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы працавалі амаль выключна па лекцыйнаму мэтаду і толькі ў нязначнай частцы работа гэтых устаноў праходзіла па актыўнаму лябараторнаму мэтаду. Вельмі слаба была пастаўлена вытворчая практыка.

У 1929-30 навучальным годзе дасягнуты значны пералом у прафэсыянальна-тэхнічных навучальных установах. Большая частка заняткаў праводзіцца лябораторным мэтадам: паступова наладжваецца вытворчая практыка, якая займае каля 40-50 проц. усяго навучальнага пляну.

Зразумела, што ў справе вытворчай практыкі яшчэ няма дастатковай наладжанасьці з тае прычыны, што да сучасната моманту ёсьць асобныя гас падарчыя арганізацыі і асобныя прадпрыемствы, якія не зразумелі ўсёй важнасьці гэтай справы і якія ня ўсім ахвотна, а ў некаторых выпадках нават, можна сказаць, злачынна адносяцца да практыкантаў, пасланых на вытворчасьць. Напрыклад, адзін завод заявіў студэнтам індустрыяльнага тэхнікуму: «Вы, рабіты, калі хочаце, можаце прыходзіць на завод, глядзець, як мы працуем, мы будзем выплачваць паложаную практыкантам заработную плату, але ня лезьце ў вытворчасьць, не перашкаджайце нам працаваць».

Справа з вытворчай практыкай цяпер ужо наладжваецца, уводзіцца вызначаная сыстэма правядзеньня практыкі. Па лініі гаспадарчых арганізацый прыняты адпаведныя меры да аказаньня садзейнічаньня навучальным установам у правядзеньні вытворчай практыкі.

Калі больш-менш наладжваецца пытаньне палітэхнізацыі прафэсыянальна-тэхнічных навучальных устаноў, дык па палітэхнізацыі масавай школы маюцца яшчэ толькі спробы, паасобныя крокі. Тут яшчэ няма большменш вызначаных форм і мэтадаў працы ,хаця прынцыповыя рашэньні па гэтым пытаньні і ёсьць, але на мясцох гэтыя рашэньні праводзяцца ўродліва.

Па прыкладу РСФСР мы правялі ў БССР 1-шы Ўсебеларускі зьезд па палітэхнізацыі школы. На гэтым зьезьдзе былі прадстаўлены, акрамя органаў Народнай Асьветы і настаўнікаў, гаспадарчыя арганізацыі, калгасная сыстэма і шмат рабочых з вытворчасьці.

Палітэхнічны зьезд, папярэдняя падрыхтоўка да якога была праведзена даволі шырока сярод працоўных мас, зрабіў некаторы эрух у справе палітэхнізацыі масавай школы. У сучасны момант мы маем наступнае становішча: усе сямігадовыя школы ў горадзе па зьместу сваёй работы пераведзены ў школы тыпу ФЗС, а ў вёсцы —у школы ШКМ; адпаведным чынам перапрацаваны навучальныя пляны і праграмы. Амаль усе сямігадовыя школы, за рэдкімі выключэньнямі, прымацаваны да асобных прадпрыемстваў. Што датычыцца ШКМ, дык да калгасаў і саўгасаў з іх прымацавана нязначная колькасьць. Прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў дае добрыя вынікі, асабліва ў тых мясцох, дзе прадпрыемствы глядзяць на школы, як на свой асноўны цэх, дзе школы уключаны ў прамфінплян прадпрыемства.

Вялікім недахопам у справе палітэхнізацыі школы зьяўляецца тое, што мы да гэтага часу ня маем яшчэ ў БССР выпрацаванага тыпаў памяшканьняў і абсталяваньняў. Для палітэхнічнай школы НКАсьветы БССР арганізуецца цэнтральная база па забесьпячэньні ўсіх масавых школ адпаведным абсталяваньнем. Дана заданьне Навукова-Дасьледчаму Інстытуту пэдалёгіі і пэдагогікі разам з мэтадкомам і штандартным камітэтам выпрацаваць тыповыя штандартныя праекты як памяшканьняў, так і майстэрняў спэцыяльнага абсталяваньня для палітэхнічнай школы.

Мабілізуем працоўныя масы на барацьбу за культрэвалюцыю

XVI зьезд УсеКП(б) па пытаньні культурнага будаўніцтва сказаў: «XV зьезд зусім правільна высунуў, як адну з важнейшых праблем рэканструкцыйнага пэрыяду, праблему культурнага будаўніцтва. Аднак тэмпы разгортваньня культурнага будаўніцтва ў краіне зусім недастатковыя. Зьезд зварочвае ўвагу на неабходнасьць іх узмацненьня. Правядзеньне ўсеагульнага абавязковага першапачатковага навучаньня і ліквідацыя няпісьменнасьці павінны стаць баявымі задачамі партыі на бліжэйшы пэрыяд».

У справе ўсеагульнага абавязковага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школы, дзякуючы ленінскаму кіраўніцтву КП(б)Б, БССР атрымала значныя дасягненьні, якія трэба замацоўваць і пашыраць. Зараз перад намі стаіць баявая задача—барацьба за ўдарныя тэмпы работы на фронце культурнага будаўніцтва.

Па лініі ЦК КП(б)Б , ЦВК і СНК БССР дадзены дырэктывы для палепшаньня якасьці работы па ўсеагульным абавязковым навучаньні, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школы. Гэтыя дырэктывы абавязваюць партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі больш займацца, больш адводзіць увагі пытаньням культурнай рэвалюцыі:—гэтаму баявому вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Разгорнуты сацыялістычны наступ па ўсім фронце выклікае шалёнае супраціўленьне з боку клясавага ворага. Клясавая барацьба знаходзіць свой адбітак і на фронце культурнай рэвалюцыі. Клясавы вораг праз сваю агентуру—контр-рэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў на працягу пэўнага часу выкарыстоўваў рад вучасткаў, асабліва культурны, для барацьбы супроць пралетарскай дыктатуры за рэстаўрацыю капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне.

Клясава-варожыя элементы вядуць рашучы наступ супроць увядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школ. Мы маем цэлы рад зафіксаваных фактаў, калі кулакі ў вёсцы вядуць разбуральную работу супроць усеагульнага навучаньня, калі сэктанты і розныя клерыкалы агітуюць супроць савецкай школы. Нам трэба павесьці самую рашучую барацьбу з выступленьнямі клясава-варожых элемэнтаў на фронце культурнага будаўніцтва, мы павінны змагацца з імі ня менш жорстка і рашуча, чым мы змагаемся з выступленьнямі клясавага ворага ў гаспадарчым сацыялістычным будаўніцтве.

Ня гледзячы на недахопы, якія былі да гэтага часу ў справе ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школы, мы ўпэўнены, што дырэктывы партыі і ўраду на пытаньнях культурнага будаўніцтва будуць выкананы. Гэта будзе моцны ўдар па клясавым ворагу.

А. Ивагун.

Праверка выкананьня дырэктыў партыі і ўраду

(Па матар'ялах РСІ)

НА ХВАЛЯХ САМАЦЕКУ

плыве апарат Наркамзему і Калгасцэнтру замест ударнай падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны

Раёнам яшчэ ня дадзены кантрольныя лічбы; ня складзен плян фінансаваньня. Адсутнічае плян барацьбы са шкоднікамі. Ачыстка насеньня, збор насенфондаў, рамонт с.-г. інвэнтару не наладжаны. У Мазырскім раёне стравілі на корм гатунковае насеньне. Замест 729—адрамантавана толькі 129 трактараў. Белсельбуд адмовіўся ад кіраўніцтва будаўніцтвам—раёны будуюць бяз плянаў

Баявы загад партыі і ўраду ня выкананы

Патрэбен рашучы пералом

Ня гледзячы на рад дырэктыў партыі і ўраду, падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі у БССР праходзіць надзвычайна марудна. Правадзімая зараз ЦКК НК РСІ праверка выкананьня дырэктыў партыі і ўраду выявіла рад абураючых фактаў зрыву своячасовай падрыхтоўкі да сяўбы. Большасьць цэнтральных установ не разгарнулі работы па падрыхтоўцы да вясны.

Пляны веснавой пасеўнай кампаніі да вызначанага партыяй і ўрадам тэрміну не даведзены да месц. У складаньні плянаў мацца блытанина і нячоткасьць. Кантрольныя лічбы веснавой кампаніі Наркамзем паслаў на нізы толькі 5.XII. Адгэтуль ня дзіўна, што ў некаторых мясцох пляны да мас не даведзены і сёньня. Таксама не даведзены яшчэ да нізоў пляны па мінэральным угнаеньні, вапнаваньні глебы і тарфаваньні. Яшчэ і да гэтага часу канчаткова не распрацаваны пляны па машынізацыі сельскагаспадарчай, садова-гародніцтву, жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі, на тэхкультурах землеўпарадкаваньні, на барацьбе са шкоднікамі, ачыстцы насеньня і аб рамонце інвэнтару. Бачачы такое нядбайства з боку НКЗ БССР, цэлы рад сыстэм разаслалі кантрольныя лічбы мясцом на сваёй ініцыятыве. Зразумелая рэч, што гэтыя кантрольныя лічбы пасланы з вялікім спазьненьнем. Не дачакаўшыся да 1-га студзеня ад Наркамзему кантрольных лічбаў, многія раёны самі разаслалі на калгасах пляны і кантрольныя лічбы, складзеныя на свой погляд. Зараз Наркамзем і Белкалгасцэнтр пачалі нанова зьмяняць кантрольныя лічбы. Мацца рад буйных памылак; кантрольныя лічбы былі даведзены не як кантрольныя, а як плянаваньне бяз выяўленьня і ўлічэньня мясцовых магчымасьцяй і бяз усякага абгаворваньня шырокай грамадзкасьцю жаўтасьнікаў, саўтасьнікаў і працоўнага сялянства. На сёньняшні дзень пляны складзены па саўгасах на 50 проц., па калгасах—на 32 проц. Плян фінансаваньня ўсіх мерапрыемстваў яшчэ ня складзены і не абгаворваны ў належных інстанцыях. Збор насенных і страхавых фондаў ідзе надзвычай марудна. Паводле вестак на 10-I 1931 г., плян стварэньня насенфондаў па калгасным сыстэме выкананы ўсяго на 58 проц.; па адназасобным сэктары збор насеньня ідзе горш. Па лініі КСУ заданьне выканана ўсяго на 5 проц. Абмен насеньня ідзе надзвычайна слаба, вучоту яма. Абмен гатунковага насеньня ў большасьці раёнаў не наладжаны. У многіх раёнах бяруць на корм гатунковае насеньне і ніхто да гэтага часу ня прыцягнуты да адказнасьці. Мазырскі раён дашоў да таго, што гатунковае збожжа скарыстоўвае на корм.

Загатоўка насеньня ў БССР ідзе надзвычайна дрэнна, менавіта: канюшыны загатоўлена —3,4 проц., цімафееўкі—2,7 проц., вікі—13 проц., сэрадэлі—0,9 проц., лубіну—1,2 проц., моркву—0,5 проц., цыбулі—0.05 проц., рэпы—0,9 проц., бураковy—1 проц.

Для разгортваньня загатовак ніякіх захадаў ня прымаецца.

Асабліва трэба падкрэсьліць безьдзейнасьць Белкаапсаюзу у справе падрыхтоўкі гародніх гаспадарак да сяўбы. За гэту бязьдзейнасьць Цэнтрасаюз ў сваёй тэлеграме ад 7-га лютага за № 41062 на імя ЦКК СНК РСІ БССР просіць прыцягнуць да адказнасьці канкрэтных зрыўшчыкаў падрыхтоўкі да сяўбы прыгарадных гаспадарак.

Ачыстка насеньня ідзе надзвычай дрэнна ня толькі ў індывідуальным сэктары, але ў калгасах і саўгасах. Па вестках Белсельтрэсту плян ачысткі выкананы толькі на 7 проц. Цэнтральныя ўстановы зусім ня велюють аб ходзе ачысткі насеньня. Пляны загатовак насеньня да сельсаветаў не даведзены, таксама як і цьвёрдыя заданьні да кулацкіх гаспадарак.

Завоз сельска-гаспадарчых машын па лініі Трактарацэнтру, саюзных трэстаў і Белкасонабу праходзіць незадавальняюча. Камісія па разьмеркаваньні с.-г. машын пры НКЗ БССР бязьдзейнічае. Загатоўка штучнага ўгнаеньня за асобны квартал выкананa толькі на 30.40 проц. пляну. Вінавата ў гэтым, галоўным чынам, акцыйнае т-ва мінэральных угнаеньняў. Белсельтрэст завёз толькі 23 проц. патрэбнага штучнага ўгнаеньня.

План барацьбы со шкоднікамі не распрацаваны і раённым установам ніякіх указаньняў ня дадзена.

У надзвычайна пагражаючым становішчы знаходзіцца завоз спробнага с.-г. інвэнтару. Белкалгасснаб не распрацаваў і не ўзгадніў з адпаведнымі органамі своячасова плянаў завозу. Пасобныя работнікі з Белкаапсаюзу ня ведаюць становішча забесьпячэньня веснавой сяўбы с.-г. машынамі, Рамонт с.-г. інвэнтара праходзіць вельмі дрэнна. Па Трактарацэнтры арганізавана адна сталая майстэрня (Койданава). Гэта ў той час, калі агульны лік трактароў, патрабуючых рамонту, дасягае 729 штук. На сёньняшні дзень адрамантавана 129 трактараў, або 18 проц. Адчуваецца вялікі недахоп запасных частак да трактароў. Па сьвяводу замест 44 адрамантаванах 8 трактароў; па лініі Белкалгасцэнтру—29 трактараў, або 30 проц. У такім становішчы знаходзіцца і рамонт с.-г. машын па лініі Белкалгасцэнтру, які павінен быў арганізаваць 315 кузьняў, аднак да гэтага часу не арганізавана яшчэ шводнай. Белкалгасцэнтр ня мае ніякіх вестак, як рамантуецца с.-г. інвэнтар на месцах. Белсельтрэст арганізаваў 2 рамонтных майстэрні замест належных 4-х.

Збор попелу, вапнаваньне і тарфаваньне амаль-што нідзе не разгорнуты. Белсельтрэст выканаў толькі 9 проц. пляну загатоўкі вапны попелу сабрана 17 проц. заданьня. Што-ж да Белкалгасцэнтру, дык ён зноў-такі ніякіх вестак ня мае. Гарсаветы на збор попелу не зьвяртаюць увагі.

Будаўніцтва оадай што усюды ідзе самацёкам. Мерапрыемствы па жывёлагадоўлі праводзяцца Наркамземам, Белкалгасцэнтрам, Белмясам, Белкаапсаюзам і інш. установамі з вялікім спазьненьнем. Належных указаньняў на месцах няма, бо яны яшчэ не распрацаваны. Статак пазімаваны толькі на 16 проц. намечанага пляну.

Стварэньне насенных фондаў ідзе дрэнна: па саўгасах загатавана толькі 25 проц. заданьня.

У падрыхтоўцы прыгародных гаспадарак да сяўбы няма ніякага парадку і плянавасьці. Выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па заснаваньні прыгародных гаспадарак не забясьпечана з боку Белсельбуду, які зусім адмовіўся займацца будаўніцтвам прыгародных гаспадарак. Большасьць раёнаў працуе бяз плянаў, у выніку чаго падрыхтоўка будаўнічых матар'ялаў не пачата, а кулацкія будынкі не прыстасоўваюцца да карыстаньня (Вясляўскі, Дубровенск інш. раёны). Па саўгасах падрыхтоўка да будаўніцтва ня лепшая, а па лініі Сельбуду наглядаецца поўны зрыў будаўніцтва.

Крэдытаваньне яшчэ зусім не абмеркавана і невядома, як яно будзе праводзіцца. Удзел у пасеўкампаніі камсамольскіх, прафесыянальных, шэфскіх і інш. арганізацый зусім недастатковы. Яны не надумаліся нават паслаць сваіх прапаўнікоў на дапамогу пасеўкампаніі.

Пашырэньне калектывізацыі не было яшчэ належных тэмпаў.

Дапамогі і кіраўніцтва з боку Белкалгасцэнтру ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы не адчуваецца. Па лініі саўгасаў амаль-што ніхто не выяжджаў для дапамогі падрыхтаванца да сяўбы. Толькі Наркамзем выслаў 14 кваліфікаваных інжынэраў, 14 рабочых па рамонту інвэнтара і 20 адказных прапаўнікоў.

Друк, за выключэньнем «Савецкая Беларусі», «Зьвязды» і Рабочего» ні мясцовы, ні насьценны не разгарнулі дастаткова на сваіх старонках асьвятленьня пасеўкампаніі.

Трэба адзначыць, што зробленая ЦКК НК РСІ БССР праверка падрыхтоўкі да пасеўкампаніі і калектывізацыі паказала, што раённыя органы ў асноўным яшчэ не пераключыліся на сыстэматычны масавы кантроль, падрыхтоўкі да веснавой пасеўкампаніі. Ня гледзячы на ўказаньні ЦКК НК РСІ БССР у лісьце ад 22-XII і ранейшых указаньні, цэлы рад райКК РСІ зусім яшчэ не займаліся праверкаю гатоўнасьці да сяўбы, за выключэньнем некаторых адзінак. (Мсьціслаўскі раён і інш. дзе маюцца ўжо належныя вынікі).

Пляны кантрактацыі цэнтральнымі ўстановамі яшчэ да гэтага часу ня складзены і не даведзены да месц. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі да гэтага часу не распрацавана, што пагражае насьпяховаму правядзеньню кантрактацыі ў вызначаны тэрмін.

Трэба рашуча ўдарыць па ўсіх праявах правага апартунізму на практыцы ў падрыхтоўцы да сяўбы і прымірэньству да яго. Баявы загад партыі і ўраду аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі павінен быць і будзе выкананы. Для гэтага зараз-жа неабходна зрабіць рашучы пералом у падрыхтоўцы да вясны на ходу выкрашіць маючыяся недахопы, бязьлітасна змагацца з кулацтвам і яго агентурай—правасьлявацкім апартунізмам мабілізаваць самыя шырокія рабочыя, калгасныя і бяднацка-сераднацкія масы на падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

А. Фандарэнка.

Зьняць рагаткі перашкод у падрыхтоўцы да сяўбы, пераключыцца на ўдарныя тэмпы

(На нарадзе работнікаў лёнаводных раёнаў).

8-га лютага пры Белільнасаюзе адкрылася нарада старшыень і аграномаў райкаапсаюзаў лёнаводных раёнаў. На нараду прыбылі прадстаўнікі з 29 раёнаў.

На парадку дню нарады пастаўлены наступныя пытаньні: 1) веснавая пасеўная кампанія і кантрактацыя; 2) ход загатовак лёну і 3) вытворчае каапераваньне і мабілізацыя сродкаў.

Першым пытаньнем быў заслуханы даклад тав. Лаціса аб веснавой сяўбе і кантрактацыі, у якім ён ахарактарызаваў нездавальняючыя тэмпы падрыхтоўкі да вясны. Па некаторых паказьніках да сяўбы рыхтуецца значна горш, чым летась.

У спрэчках па дакладу тав. Лаціса, быў адзначаны цэлы рад недахопаў, якія перашкаджаюць нармальнай падрыхтоўцы да сяўбы.

Тав. Гурэвіч (Гарадоцкі раён) кажа, што ў падрыхтоўцы да сяўбы па Гарадоцкім раёне ёсьць пэўны прарыў, што было канстатавана на апошнім пленуме Гарадоцкага райкому КП(б)Б. Да кантрактацыі ярыны пачалі рыхтавацца позна. Пакуль-што, яшчэ невядома колькі будзе завезена ўгнаеньня, колькі будзе атрымана авансаў, хлеба, тавараў. Аб гэтых пытаньнях трэба было ўжо таварыць некалькі месяцаў таму назад.

На складах ляжыць шмат сельска-гаспадарчых машын, але да гэтага часу ня вызначаны крэдыт для калгасаў, у выніку чаго, яны ня могуць набываць с.-г. машыны і інвэнтар. Райкаапсаюз нават быў прымушаны выдаваць трыеры калгасам пад расьпіскі.

Дрэнна абстаіць справа з насеньнем. Раён своячасова не паклапаціўся аб гэтым і добрае семя накіроўвалася на алейны завод.

— Па Сіроцінскім раёне,—кажа тав. Даўжэнкоў,—да гэтага часу нічога ня зроблена па рамонту с.-г. інвэнтара і машын, няма вугалю. Аб гэтым ніхто не клапоціцца. На складах ляжыць сельска-гаспадарчыя машыны але іх не бяруць, бо ня вызначаны крэдыты для калгасаў.

Тав. Прудникаў (Бешанковіцкі раён) кажа, што трэба зараз-жа падумаць і аб уборцы ўраджаю. Трэба дабіцца завозу лёнаперабілак у выстарчальнай колькасьці.

Прадстаўнік Лёзьненскага раёну тав Гарэцкі таксама апынаецца на тым, што рамонт с.г машын праводзіцца дрэнна. Самтрамсаюз не зацікаўлены ў тым, каб працавала кузьня. Не хапае жалеза самага звычайнага. Вазну (1500 тон) пачалі развозіць толькі нядаўна. Рэалізацыя ўгнаеньня і с-г машын праходзіць дрэнна. Ёсьць выпадкі, калі зараз стаяць без работы зерняачышчальныя машыны.

Тав. Афанасенка (Сураскі раён) спыняецца на тым, што да гэтага часу ня выконваецца плянавая завозка ўгнаеньня. Пакуль-што раён атрымаў 5 вагонаў касьцяной мукі. Трэба зараз-жа падумаць і аб апрацоўцы лёну.

Тав. Кашчоў (Багушэўскі раён) кажа, што да апошняга часу ня прысланы пляны будаўніцтва, няма тэхнікаў.

Згубілі сувязь з аднаасобнікамі

У Старасельскім сельсавеце калгасы яшчэ не рабілі справаздач перад аднаасобнымі гаспадаркамі. Аднаасобнікі ня ведаюць аб посьпехах і тых перавагах, якія дае буйная гаспадарка. Кулак, які імкнецца падарваць калгаснае будаўніцтва, апітуе супрэць калгасаў.

Райкалгасаюз слаба кіруе калгасным рухам.

А. Батурэвіч.

Копыскі р-н.

Рабселькоры сыгналізуюць

(АГЛЯД КАРЭСПАНДЭНЦЫІ)

Народна-гаспадарчы плян на 1931 г. прадугледжвае шпаркія тэмпы ўздыму сельскай гаспадаркі, культурнага будаўніцтва ў вёсцы.

Гэтыя вялізарнейшыя тэмпы сацыялістычнай перабудовы вёскі патрабуюць шматлікіх сродкаў. Крыніцаю гэтых сродкаў зьяўляюцца: выпускаемыя на шай дзяржавай пазыкі, розныя зборы, мабілізацыя сродкаў насельніцтва праз ашчадкасы і г. д. Наш агляд павінен паказаць, як адпаведныя арганізацыі праводзяць у жыцьцё дырэктывы партыі і ўраду па мібілізацыі сродкаў насельніцтва на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва.

Вось як «мабілізуюць» сродкі насельніцтва ў радзе месц. Наш селькор Хмель паведамляе, што па Бабініцкім сельсавеце (Ветрынскі р.) кантрольнае заданьне па падпісцы на пазыку «Пяцігодка ў 4 гады», на паперы выкананa па 100 проц. Але на справе?—«Прайшло ўжо тры месяцы, як... праведзена падпіска на пазыку, а работа з месца ня зрушылася»,—дадае аўтар.

Селькор Вішня паведамляе, што ў Капыльскім раёне ня чуваць пра пазыку «Пяцігодка—у 4 гады». Ён тлумачыць гэта тым, што партыйныя і камсамольскія арганізацыі аднесьліся наплявацельскі да мабілізацыі сродкаў. «Камсамольская арганізацыя недавыканала заданьне на 25 проц., парт арганізацыя—на 17 проц. Ня ўсе камсамольцы раёну маюць аблігацыі пазыкі. Гэтак-жа аднесьліся да рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—у чатыры гады» і РВК, і сельсаветы. Камісіі садзейнічаньня Капыльскага раёну нічога ня робяць».

Наш карэспандэнт Н. Брунэт даводзіць, што падпіска на пазыку па Бягомльскім раёне праведзена здавальняюча. Але... некаторыя ўстановы ўзносы затрымліваюць у сябе доўгі час. «Бягомльскі вучастак лесапрамгасу цэлы месяц затрымліваў 100 руб. узносаў на пазыку, сабраных са служачых за лістапад месяц. Таксама лістападаўскія ўзносы Бягомльскі райкаапсаюз здаў у банк толькі 21 сьнежня... Бягомльскім камбінатам лістападаўскія ўзносы на пазыку ўнесены ў райбанк 28 сьнежня». Аб тым, што ў вёсцы Бор, Будзенскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну ніводзін селянін ня мае аблігацыі, паведамляе нам і тав. Ул. Высоцкі. Ён лічыць тая вынікам апартуністычнай бязьдзейнасьці некаторых раённых кіраўнікоў.

Наш карэспандэнт Зоркі піша, што ў Сьмілавіцкім раёне насельніцтва нічога ня ведае аб адназразовым зборы на культурнае будаўніцтва. Рад сельсаветаў бязьдзейнічаюць. Некаторыя сельсаветы праяўляюць нават правапартуністычную практыку ў гэтым напрамку. Аўтар ня ведае нават, як кваліфікаваць паводзіны старшыні Дукорскага сельсавету т. Малахоўскага, які, пра ўвядзеньне аднаразовага збору на культурнае будаўніцтва ў вёсцы, сказаў: «У вышэйшых установах сядзяць галавацяпы, якія ня ведаюць, што сельсавет загружаны больш важнымі справамі, а яны яшчэ шлюць глупыя зборы!» Аўтар допісу патрабуе зрыўшчыка ўрадавых дырэктыў прыцягнуць да суровай адказнасьці.

«Па Забалоцкім сельсавеце Расьнянскага раёну самаабкладаньне спагнана толькі на 81,5 проц., падпіска на пазыку афармлена ўсяго на 64,4 проц., страхоўка спагнана на 81,3 проц. Старшыня сельсавету тав. Юрчанка А., старшыня КСУ Вораная С. і старшыня арцелі «Чырвоная Рунь» тав. Мікіценка, склікаўшы прэзыдыум сельсавету, зьявіліся на яго п'янымі, а таму нічога і ня вырашылі. Старшыня сельсавету Юрчанка выганяў сялян з пасяджэньня прэзыдыуму за каўнер», паведамляе селькор Ш.

«Кіраўнікі Чашніцкага РВК на грошы па бюджэту РВК закупілі дзьве мяккія канапы, за якія заплацілі каля 300 рублёў. Гэта ў той час, калі ў райвыканкоме шмат у чым адчуваецца недахват. Напрыклад: не хапае сталоў, некаторыя працаўнікі сядзяць па 2 за адным сталом, няма шаф для спраў, нават, няма ў дастатковай колькасьці лямпаў. Калі загадчыкі дзіцячых ясьляў па шэсьць разоў ходзяць за атрыманьнем зарплаты, дык ім адказваюць: «няма грошай і што яны могуць зачыняць ясьлі». Рабочы вылучэнец з папяровай фабрыкі «Чырвоная Зорка» тав. Буяльскі працуе сакратаром сельсавету і ўжо тры месяцы ходзіць у райвыканком, каб атрымаць пэнсію, а яму адказваюць: «няма грошай»,—паведамляе нам т. Крапіва.

Вялікую ролю ў мабілізацыі сродкаў адыгрываюць ашчадкасы. Як-жа яны на справе праводзяць сваю работу? Селькораўскія допісы паказваюць, што пымат якія ашчадкасы дрэнна працуюць.

«Дрысенская ашчадкаса вандруе»—піша нам Флораў. Загадчык гэтай ашчадкасы тав. Фуреаў замест растлумачальнай работы сярод насельніцтва, прымушан бегаць па ўстановах, каб знайсьці месца для работы. Так, ён вандруе з свайго памяшканьня ў памяшканьне пракурора, адгэтуль—у райкаапсаюз і г. д. і ўсё гэта таму, што няма адпаведнага памяшканьня для ашчадкасы. Аб гэткім-жа дрэнным становішчы з памяшканьнем у Лельчыцкай райашчадкасе паведамляе нам тав. Х. Г—н.

«У Іржоўскім сельсавеце, Прапойскага раёну другі месяц, як існуе каса ашчадкасьці, але грошы хаваюцца ў кішэні з-за адсутнасьці касы, грашовай скрынкі, шафы і г. д.»—паведамляе нам тав. Сапраненкаў. Між тым шафы і сталы маюцца ў калгасе «Камунар», які абслугоўвае гэта ашчадкаса. Але старшыня калгасу т. Пятроў не жадае даць ашчадкасе патрэбныя ёй рэчы. Селькор Камсамолец паведамляе, што ў вёсцы Людвіна, Хойніцкага раёну дрэнна праводзяць работу па ашчадоправе работнікі гэтай касы—камсамольцы Іванценка Рыгор і Буланы Іван.

Гэта ўсё адмоўныя бакі ў рабоце па мабілізацыі сродкаў. Гэтыя адмоўныя бакі трэба зараз-жа ліквідаваць і ўзяць прыклад з тых, хто добра, сумленна дапамагае пралетарскай дзяржаве ў мабілізацыі сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва.

Вось з каго трэба браць прыклад. Тав. Ярмак нам паведамляе, што студэнты Гомельскага агрэпэдінстытуту пастанавілі штомесяц сваю стыпэндыю пераводзіць у ашчадкасу. Усе гэтыя студэнты зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы і праз яе атрымліваюць стыпэндыю. Гэтыя студэнты выклікалі на сацспаборніцтва саўпартыкому, каб яна зрабіла тое самае, але дагэтуль адказу няма. Калектыў студэнтаў Гомельскага атрапэдінстытуту выклікае ўсе іншыя навучальныя ўстановы зрабіць па іх прыкладу. Тав. Лявіцкі нам паведамляе, што ашчадкаса Сьмілавіцкага раёну вельмі добра праводзіць работу па мабілізацыі сродкаў. Дзякуючы такой рабоце, квартальнае заданьне ашчадкасай перавыкананa.

Л. П.

Толькі пяць дзён

засталося да канца ўдарнага месячніка,

а бальшавіцкіх тэмпаў няма

У гонар X Усебеларускага зьезду саветаў ліквідуем прарывы на лесазагатоўчым фронце арганізацыяй чырвоных абозаў, суботнікаў па загатоўцы і вывазцы лесу да станцый і прыстаняй.

Лепшы падарунак X зьезду саветаў—

ліквідацыя прарыву ў лесазагатоўках і вывазцы

Лічаныя дні засталіся да канца ўдарнага месячніка на вывазцы і загатоўцы лесу. У бліжэйшы час можна чакаць таксама і сапраўднага сапраўднага дарогі. Таму шпаркае і энэргічнае выкананьне пляну загатоўкі і вывазкі лесу мае зараз вялікае значэньне.

Мы паведамлялі аб тым, што плян лесазагатовак (асабліва дроў) і вывазкі знаходзіцца пад сур'ёзнай пагрозай зрыву. Карэспандэнцыі з месц пацьвярджаюць гэта з усёй яскравасьцю.

Сур'ёзная пагроза невыкананьня вывазкі лесу цяпер за сабой прарыў ня толькі ў лесазагатоўках, але ў нашай прамысловасьці, бо ад выкананьня пляну загатоўкі лесу, залежыць у значнай меры выкананьне пратрам дрэвапрацоўчых заводаў і нашага будаўніцтва, якое патрабуе вялікай колькасьці лесаматар'ялаў.

Трэба адзначыць, што сыгналы другу часам не даходзяць да арганізацый і ўстаноў, якія павінна займацца лесазагатоўкай.

Апартуністычная практыка некаторых райкомаў партыі (Пухавічы, Глуск), РВК і сельсветаў перашкаджаюць выкананьню вытворчых заданьняў па лесавывазцы. Факты, якія мы сягодня падаем, пацьвярджаюць гэта.

Там, дзе па кулаку ўдарылі слаба, дзе цьвёрдае заданьне не даведзена да кулацкіх гаспадарак і нават там, дзе гэтыя заданьні даведзены, але не праводзяцца ў жыцьцё—там пляны лесазагатовак знаходзяцца пад пагрозай зрыву.

Мы павінны з усёй рашучасьцю ўдарыць па тых, хто прымірэнча адносіцца да кулацтва і тым самым робіць справу класавага ворага, б'е па мерапрыемствах партыі і ўраду.

З другога боку, там, дзе за справу лесавывазкі ўзяліся сапраўды па бальшавіцку, дзе мабілізавана маса калгасьнікаў, беднякоў і серадняковy, там пляны выконваюцца, прарывы ліквідуюцца.

Засталіся лічаныя дні і калі зараз не дабіцца сапраўднага ўдарнага зруху, дык цяжка гаварыць аб магчымасьці выкананьня пляну.

Праз 10 дзён адарвацца Усебеларускі зьезд саветаў. Наша газэта арганізуе «рапарт мільёнаў». У гэтых рапартах рабочыя, калгасьнікі, бяднякі-серадняцкія масы вёскі даложаць зьезду пра свае дасягненьні ў барацьбе з 5 годку ў 4 гады, за далейшыя посьпехі сацбудаўніцтва.

Лепшы падарунак зьезду з лесазагатоўчага фронту—гэта поўнае выкананьне праграмы па загатоўцы, вывазцы, лепшая падрыхтоўка да сплаўной кампаніі.

Ужо зараз шэраг калгасаў і вёсак пастанавілі арганізаваць чырвоныя абозы з лесам імя 10-га Усебеларускага зьезду саветаў. Гэтыя абозы лепшы доказ сьвядомасьці шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і серадняковy.

Перад партыйнымі, савецкімі і прафесыянальнымі арганізацыямі на месцах паўстае задача арганізацыі гэтых чырвоных абозаў, мабілізацыі актыўнасьці мас на ліквідацыю прарываў на лесазагатоўчым фронце.

Чырвонымі абозамі, шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва ліквідуем прарыў у лесазагатоўках.

Студзень ня даў пералому

Студзень месяц па Сьмілаўшчыне ў справе лесазагатовак ня даў ніякага пералому. Цьвёрдыя заданьні па вывазцы дроў і лесаматар'ялаў у многіх сельсаветах Вучлеспрамгасам былі даведзены са значным спазьненьнем.

Дукорскі сельсавет пачаў раздаваць нарады сялянам на вывазку лесаматар'ялаў толькі 20 студзеня. Па Рудзенскім сельсавеце гэтая работа таксама была праведзена са значным спазьненьнем. Паводле-ж распараджэньня Вучлеспрамгасу гэтыя нарады павінны былі быць выкананы да 1-га лютага, але з прычыны позняга паведамленьня, выканаць іх было немагчыма.

Спрыяючых умоў для выкананьня пляну вывазкі лесаматар'ялаў і дроў па ўсім раёне няма. Сьмілавіцкае райспажыўтаварыства зусім ня цікавіцца забясьпечаньнем лесанозаў і лесарубаў неабходнымі рэчамі, як лыка, вяроўка і інш.

Некаторыя сельсветы вельмі фармальна адносяцца да справы лесазагатовак.

Трэба напярэдадзь зрыў кампаніі вывазкі дроў і лесаматар'ялаў у Сьмілаўскім раёне.

РК-РСІ павінна паклапаціцца, каб спажывецкая каапэрацыя занялася пытаньнем забясьпечаньня лесазагатовак дэфіцытнымі таварамі. Трэба зьнішчыць фармалізм і бязьдзейнасьць у рабоце сельсветаў па лесазагатоўках.

Эр—р.

На апартуністычным коніку лесу ня вывезеш

Бюракратызм і стаўка на самацёк зрываюць лесавывазку ў Пухавічах

З 20.I пастановай ЦК КП(б)Б абвешчаны месячнік па лесазагатоўцы і вывазцы, а Пухавіцкі РВК толькі 29-I успомніў, што трэба склікаць нараду старшынь сельсветаў.

Трэба сказаць, што, апрача агульных разважэньняў з боку сакратара РК тав. Марчанкі, нічога ня было зроблена. Нават па апартуністычнай практыцы паасобных сельсветаў ня было ўдарана в усёй рашучасьцю. А такая практыка на мясцох маецца.

Вось лічбы выслаў на лесавывазку па Пухавіцкім раёне за студзень месяц: у Дрычынскім сельсавеце—259 Цытцянскім—219, Сяргееўскім—71, а ў Шацкім—0.

Яўна апартуністычныя адносіны пасобных сельсветаў да лесазагатовак былі ўзяты на нарадзе пад абарону самым сакратаром РК тав. Марчанка. Ён, замест таго, каб на бальшавіцку ўдарыць па сьпячных, змазаў нядбайнасьць гэтых сельсветаў.

Вось і другі агіднейшы факт прымірэнчых адносін да кулацка-заможнай часткі з боку Задошчынскага і Слабодзкага сельсветаў. Па Задошчынскім сельсавеце на заможна-кулацкіх групы былі накладзены штрафы за злоснае ўхіленьне ад гужавінасьці ад 25 да 150 руб., але гэтыя штрафы засталіся толькі на паперы.

Па Слабодзкім сельсавеце 22 студзеня аштрафаваны кулак Леньцэвіч Кірыл на 150 руб. і заможнікі Урублёўскі Міхась і Даямідовіч Барыс на 40 руб. але да гэтага часу штрафы не спагнаны. Кулакі тармозяць вывазку таму, што сельсветы неправільна націскаюць на іх, парушаючы тым самым клясавую лінію.

Загадчык Асіпавіцкага раёну Саўбелтранслесу зьвярнуўся да сакратара Пухавіцкага РК тав. Марчанка з просьбай заслухаць на бюро РК інфармацыю аб ходзе работ па лесазагатоўцы. На гэта Марчанка адказвае:

— Не магу я вас заслухоўваць, я ўжо слухаў інфармацыю па лесазагатоўках фракцыі РВК, і таму для мяне вядома, што робіцца на лесазагатоўках.

А вось і адносіны да лесазагатовак і вывазкі старшыні Асіпавіцкага Райвыканкому тав. Шакала, які сказаў;

— Калі мне прыдзецца адказваць, дык ня толькі за лесазагатоўкі, але і за ўсе кампаніі, таму нічога зрабіць не магу.

Трэба таксама адзначыць бюракратычныя адносіны працаўнікоў Беларускага аддзяленьня Дзяржбанку да Асіпавіцкага аддзяленьня Саўбелтранслесу, яны ведаюць сапраўднае становішча з запазычанасьцю рабочым лесазагатовак і ня прымаюць захадаў да зьнішчэньня гэтай запазычанасьці.

На 1-е лютага запазычанасьць па загатоўках і вывазцы дасягала 200.000 руб. Белдзяржбанк загадаў Асіпавіцкаму Аддзяленьню узмоцніць забесьпячэньне лесазагатоўчых арганізацый грашовымі знакамі, але ў Асіпавіцкім аддзяленьні кажуць, што гэта тэлеграма адносіцца да лесправгасу, а не да Саўбелтранслесу.

М.

Месячнік на дае зруху

Выпэй тэм ы вывазкі лесу

Месячнік лесазагатовак амаль падыходзіць да канца, але на Аршаншчыне пералому ў лепшы бок яшчэ няма. Як і раней, у справе лесазагатовак мы маем прарывы, значнае недавыкананьне пляну загатоўкі і вывазкі.

Раённыя арганізацыі і ўстановы, а таксама сельсветы ўсё яшчэ не завярнуліся тварам да лесазагатовак.

Сталінскі, Яромкаўскі і Варавойшанскі сельсветы ўсё ніяк ня могуць арганізаваць і даць рабочую і цягавую сілу для лесазагатовак.

Пішчалаўскі сельсавет зусім ніякага ўдзелу ў загатоўках лесу ня прымае. Гэты сельсавет ніводнага мэтру не загатовіў і ня вывез. Кожны раз, калі яго запытваюць, чаму сельсавет не дае людзей на лесазагатоўкі, ён адказвае.

— Усе людзі нашага сельсавету заняты работай на чыгунцы...

А на справе гэта ня так. На чыгунцы працуе незначная колькасьць рабочай сілы, астатняя маглі-б працаваць па лесазагатоўках, але дзякуючы бязьдзейчасьці сельсавету, на работу ня выходзяць.

Калгасы таксама зусім на прымаюць удзел у лесазагатоўках. Яны цягнуцца ў хвасьце аднаасобнікаў. Калгасы, «Авангард» і «Путлія», якія маюць па 18 і больш рабочых коняй, яшчэ ня разу ня зьяжджалі на вывазку лесу.

Зусім іншае становішча там, дзе сельсветы лесазагатоўкам аддалі належную ўвагу. У Межаўскім сельсавеце шэраг вёсак заключылі паміж сабой ўмову па сацспаборніцтву на лепшае выкананьне лесазагатовак. У гэтым-жа раёне арганізаваліся і чырвоныя абозы па вывазцы лесу.

А. Кудрын.

Чыстка савецкага апарату

Выкананьне задач рэканструкцыйнага пэрыяду патрабуе клясавай бяздольнасьці максымальнай гнуткасьці, чоткай і якаснай работы, ад апарату

Галоўсацстрах адарваны ад рабочых мас

Савет сацыялістычнага страхаваньня пры Наркампрацы зусім не працуе. За 1930 г. праведзена ўсяго тры пасяджэньні. Цікава адзначыць, што тры разы, апрача гэтага, Галоўсацстрах склікаў пасяджэньні савету, але большасьць членаў яго на пасяджэньні зусім не зьяўляліся, зрываючы як пасяджэньні савету, так і вырашэньне вельмі важных пытаньняў. Адзнай з прычын непрацаздольнасьці Галоўсацстраху зьяўляецца яго поўная адарванасьць ад рабочых мас, ад пралетарскай грамадзкасьці, ад прадпрыемстваў.

Пасяджэньні Галоўсацстраху на прадпрыемствах не праводзіліся, даклады аб дзейнасьці Савету ні разу ня ставіліся на рабочых сходах прадпрыемстваў. Паміж тым, уся работа Галоўсацстраху, асабліва, зараз павінна быць накіравана на палепшаньне бытавога становішча рабочых мас, а адсюль удзел апошніх у рабоце органаў сацыяльнага страхаваньня павінен быць абавязковым. Дырэктывы і пастановы Галоўсацстраху ня друкуюцца па афіцыйных выданьнях апошняга, а толькі дасылаюцца страхкасам, стрэхпунктам, з прычыны чаго амаль-што ніхто з рабочых, апрача супрацоўнікаў страхавых органаў, аб іх ня ведае.

Дрэнна стаіць справа і з рэвізіяй дзейнасьці як Галоўсацстраху, так і страхавых кас на мясцох. Рэвізійныя камісіі, якія існуюць пры органах Галоўсацстраху, і ў функцыі якіх, апрача рэвізіі фінансавых спраў, уваходзіць і нагляд за агульнай дзейнасьцю страхкас,—нічога ня робяць і фактычна існуюць на паперы. А ў выніку гэтага работа як Галоўсацстраху, так і яго органаў на мясцох праходзіць безкантрольна.

Пралетарская грамадзкасьць патрабуе ўзварушэньня дзейнасьці Галоўсацстраху, яго органаў на мясцох і наближэньня ўсяе работы страхавых органаў да рабочых мас.

Брыгада: Ш. Р.

Марудныя тэмпы ў разглядзе спраў Галоўсацстрахам

Брыгада па абсьледваньні работы Галоўсацстраху выявіла, што, з прычыны бязьдзейнасьці Рэспубліканскага савету сацстраху, назіраецца надта вялікая цяганіна пры разглядзе розных хадайніцтваў устаноў.

Белдзяржгандаль яшчэ ў сакавіку месяцы 1930 г. узьняў хадайніцтва перад Рэспубліканскім саветам сацстраху аб тым, каб рабочыя карчэмкі, якія працуюць на зборы матар'ялаў для кустарнага заводу, былі падведзены пад ільготны тарыф страхавых узносаў, бо нармальны тарыф павялічвае сабекошт экспортнай прадукцыі.

Галоўсацстрах замест таго, каб раней высьвятліць ці сапраўды гэта група рабочых зьвязана з работай па вырабе прадукцыі на экспарт, паклаў данае хадайніцтва ў справу... на разгляд Рэспубліканскага савету. А з гэтае прычыны, што рэспуб

Па-баявому падрыхтавацца да будаўніцтва

Пастанова калегіі НК РСІ БССР ад 30 студзеня 1931 г.

па пытаньні аб падрыхтаванасьці будаўніцтва 1931 г

А. Тэмп і разьмеры падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону не адпавядаюць тэмпам будаўніцтва трэцяга году пяцігодкі і ў параўнаньні з мінулым годам ёсьць пагоршаньне. Праекты і нарцяжы на новае будаўніцтва не атрыманы, тытульных сьпісаў у большасьці выпадкаў таксама няма, адсутнічаюць у некаторай частцы арганізацый праекты і тытульныя сьпісы на летаншяе будаўніцтва, заяўкі на будаўнічыя матар'ялы і рабочую сілу ня даны (за выключэньнем ВСНГ БССР), вывазка матар'ялаў праводзіцца толькі ў некаторых мясцох, работадаўцы не забясьпечылі патрэбнай падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону. Да гэтага часу засталіся нявырашанымі такія пытаньні, як транспартаваньне, фінансаваньне, фонды дэфіцытных матар'ялаў, пытаньне з нярудными выкапнямі. Усё гэта стварыла напружанае становішча ў будаўнічых арганізацыях і прывяло да спраты часу на падрыхтоўку да будаўніцтва 1931 году.

Б. Будаўнічыя арганізацыі не пераключылися поўнасьцю на плянавыя мэтады работы. Аб'екты не ахоплены поўнасьцю сыстэмай дагавароў, яны складаюцца без наяўнасьці папярэдніх каштарысаў і праектаў. Праекты паступаюць з вялікім спазьненьнем і ў парадку, які не адпавядае ўмовам будаўніцтва і прадпрыемства; у паступаючых праектах ня ўлічваюцца мясцовыя ўмовы, а малы і слабы склад тэхпэрсаналу на мясцох не заўсёды ў стане пераапрацоўваць іх. Мясцовыя арганізацыі ня ведаюць, дзе і як павінны зацьвярджацца праекты.

В. Фінансавае становішча будаўнічых арганізацый, з прычыны ўкладаньня сродкаў у няплянавае будаўніцтва, несваячасовага разьліку з работадаўцамі і адсутнасьці зваротных сродкаў, — напружанае.

Г. Адзначаючы зрух у галіне ўжываньня мэханізмаў на будаўніцтве, асабліва па Белдзяржбудзе, а таксама і выпрацоўку стандартных частак на прадпрыемствах, калегія канстатуе, што наяўныя мэханізмы не забясьпечваюць правільнай і поўнай мэханізацыі працэсаў будаўніцтва, што яшчэ больш пагаршаецца няправільным скарыстаньнем іх, адсутасьцю ўліку і вывучэньня іх работы. Апрача таго ня ўсімі бударганізацыямі даны заяўкі на патрэбную колькасьць будаўнічых мэханізмаў на 1931 год. Пытаньне аб ужываньні новых будаўнічых матар'ялаў бударганізацыямі не распрацавана і ў адносінах ужываньня іх назіраецца кансэрватызм.

Д. Зьніжэньню сабекошту будаўніцтва бударганізацыі не аддалі належнай увагі. Дырэктывы ўраду і партыі аб зьніжэньні сабекошту ня выкананы. Ўлік кошту выдаткаваньня матар'ялаў і рабсілы па асобных элемэнтах будаўніцтва няма, ня гледзячы на рад дырэктыў ураду ў гэтых адносінах (за выключэньнем некаторых аб'ектаў па Белдзяржбудзе, пачатых пабудовай у канцы 1930 г.).

Улічваючы ўсё вышэйпаданае, калегія НК-РСІ БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім цэнтральным будаўнічым арганізацыям, трэстам і аб'яднаньням (работадаўцам) у 3-х дзённы тэрмін разасласьць на месцы зацьверджаныя кантрольныя лічбы, за даньні і тытульныя сьпісы, а таксама прыступіць да тэрміновага складаньня генэральных плянаў.

2. У мэтах лепшага плянаваньня і своечасовага правядзеньня будаўніцтва прапанаваць усім бударганізацыям заключаць дагаворы на ўсе пабудовы. Да правядзеньня будаўніцтва прыступіць толькі пры наяўнасьці праектаў. Лічыць безгаспадарчасьцю і безадказнымі адносінамі да сродкаў пралетарскай краіны, калі якое-небудзь будаўніцтва вядзецца без дакладнага каштарысу. Праектуючым арганізацыям паскорыць і ўзмацніць тэмп прахаждэньня і окладаньня праектаў, дапасоўваючы іх да мясцовых умоў, рыхтуючы ў першую чаргу праекты асноўных аб'ектаў будаўніцтва. Абавязаць работадаўцаў своечасова даваць тэхнічна і эканамічна ўгрунтаваныя заданьні на праектаваньне. Дзяржпляну даць сваім арганізацыям на месцы неабходныя паказаньні пра парадак прахаждэньня і зацьвярджэньня праектаў на грунце пастановы СНК БССР.

3. Прапанаваць будаўнічым арганізацыям і работадаўцам не пазьней 15 лютага 1931 г. окласьці дагавары на ўсе аб'екты будаўніцтва, у якіх оуму кошту будаўніцтва паказаць на грунце папярэдняга каштарысу або кубатуры будынку, а тэрмін — на грунце пляну.

4. Для своечасовай і поўнай перавозкі будаўнічых матар'ялаў, а таксама паэбаўленьня будаўніцтва ад залежнасьці ад прыватніка—лічыць патрэбным узмацненьне самастойнага транспарту пры ўсіх будаўнічых канторах, прапанаваўшы Наркамснабу забясьпечыць своечасовае і нармальнае задаваленьне гэтага транспарту фуражом.

Побач з гэтым прапанаваць Калгасцэнтру, Белсельтрэсту і Белсельбуду ўжыць меры да выкарыстаньня транспарту саўгасаў і калгасаў, паводле дырэктыў ураду.

5. Прапанаваць работадаўцам у 5-дзённы тэрмін склясьці плян патрэб у будаўнічых матар'ялаў на 1931 год, падаўшы адпаведным арганізацыям за яўкі на іх.

Дзяржпляну тэрмінова высьветліць кантынгент адпушчаных Беларусі будаўнічых матар'ялаў і на працягу дэкады, на грунце атрыманых плянаў і заявак, разьмеркаваць іх сярод опажыўцоў, прасачыўшы за выкананьнем сваіх нарадаў, аддаючы пад суд тых, хто ня выконвае нарадаў.

Абавязаць Белдзяржснаб пасьля стварэньня фондаў забясьпечыць рэалізацыю іх, ужыўшы для гэтага неабходныя меры. У мэтах лепшага скарыстаньня матар'ялаў дазволіць будаўнічым арганізацыям рабіць перакідку і манэўраваньне іх пры наяўнасьці лішкаў на іншых пабудовах, а таксама пры часовай кансэрвацыі пабудоў.

Дзяржпляну і ВОРС'у выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па дапасаваньні новых будаўнічых матар'ялаў на будаўніцтве з разьлікам магчымасьці ўжываньня іх у будаўніцтве 1931 г.

Прапанаваць горнаму аддзелу і інстытуту прамысловасьці ВСНГ прыступіць да арганізацыі і правядзеньня вышуку новых будаўнічых матар'ялаў у Беларусі, паставіўшы перад СНК БССР пытаньне аб водпуску сродкаў на гэтую справу.

6. Абавязаць будаўнічыя арганізацыі паставіць дакладны ўлік работы мэханізмаў на пабудове, ужыўшы меры да правільнага і поўнага выкарыстаньня іх, а таксама ўзмацненьня мэханізацыі ў будаўніцтве.

7. З мэтай своечасовага і поўнага забясьпячэньня будаўніцтва працоўнай сілай і зьнішчэньня акыятажу на рынку працы прапанаваць будаўнічым арганізацыям у 3-дзённы тэрмін даць заяўкі на рабсілу, а Наркампрацы на працягу дэкады, склаўшы плян забясьпячэньня будаўніцтва рабсілай, сканцэнтраваўшы вярбоўку і пасылку рабочай сілы выключна праз органы працы.

Забараніць будаўнічым арганізацыям займацца выдачай і разьмеркаваньнем прамысловых тавараў за выключэньнем спэцвопраткі. Справу разьмеркаваньня прамтавараў перадаць поўнасьцю кааперацыі і рабочым арганізацыям.

8. Пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы па выкананьні і правядзеньні ў жыцьцё плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі ня могуць быць выкананы без актыўнага ўдзелу мас, а таму парт'ячэйкам, рабчкомам і адміністрацыі пабудоў узмацніць работу па арганізацыі і правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва як сярод рабочых, так адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

План работы будаўнічай арганізацыі прапрацаваць на сходах рабочых, давёўшы яго да брыгад.

9. Адзначаючы невыкананьне дырэктыў ураду па зьніжэньні кошту будаўніцтва і адсутнасьць належнага ўліку, прапанаваць будаўнічым арганізацыям прывесьці ў належны выгляд улік кошту будаўніцтва па асобных элемэнтах яго, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на правільную пастаноўку ўліку выдаткаваньня матар'ялаў і рабсілы па асобных элемэнтах мабілізаваўшы вакол гэтага ўвагу рабочых і тэхнічнага пэрсаналу.

10. У мэтах лепшай эксплёатацыі кар'ераў г. Менску і своечасовага забясьпячэньня будаўніцтва гравіем, пяскам і глінаю, распрацоўку і эксплёатацыю іх перадаць Белдзяржбуду, абавязаўшы яго забясьпечыць усе пабудовы г. Менску.

Прапанаваць Дзяржпляну ў тэрміновым парадку высьветліць пытаньне аб загатоўцы каменьняў.

11. Даручыць ВСНГБ абавязаць кіраўніцтва пабудовы гуты ў Касьцюкоўцы пабудаваць зьнікальную падстанцыю на тэрыторыі гэтай гуты, вызваліўшы ад гэтага гомельскую кантору Белдзяржбуду.

12. Абавязаць Будаб'яднаньне ВСНГБ забясьпечыць сваімі будаўнічымі дварамі будаўніцтва Сельбуду і іншых арганізацый стандартнымі часткамі, забараніўшы іншым будаўнічым арганізацыям арганізацыю будаўнічых двароў і майстэрань па выпрацоўцы стандартных частак будаўніцтва.

Прапанаваць ВСНГБ у 2-ходжадны тэрмін унесьці ў ЭКАНА праект арганізацыі вытворчасьці: па выпрацоўцы стандартных частак, а таксама аб канцэнтрацыі ўсіх адпушчаных на гэту мэту грашовых сродкаў і абсталяваньня.

13. У мэтах лепшай пастаноўкі праектаваньня лічыць нямэтазгодным арганізацыю самастойных праектных бюро па гарадох, сканцэнтраваўшы ўсю гэту справу ў цэнтральных праектных бюро, прапанаваўшы апошнім забясьпечыць поўнае і своечасовае складаньне праектаў.

14. Улічваючы, што будаўніцтва на сяле ў асноўным праводзіцца па тыповых праектах і стандартах і што гэта будаўніцтва павінен праводзіць Белсельбуд, лічыць нямэтазгодным стварэньне ў раёнах самастойных будаўнічых арганізацый.

15. Улічваючы, што Белсельбуд да гэтага часу абслугоўваў усе пабудовы БССР сьвідраваньнем і вытворствам артэзіянскіх калодзежаў, прапанаваць Белсельбуду ўжыць меры і забясьпечыць выкананьне заказаў па сьвідраваньні для ўсіх пабудоў БССР.

Абавязаць ВСНГ, Дзяржплян і Белсельбуд прапрацаваць пытаньне аб арганізацыі пастаноўкі справы ў такім разьмеры, каб задаволіць заяўкі ўсіх арганізацый па сьвідраваньні калодзежаў.

16. Улічваючы, што ў Менску існуюць роўналежныя будаўнічыя арганізацыі, лічыць неабходным зьліцьцё Гандальпрамбуду з Белдзяржбудам і Менбуду з Жылбудам з перадачай функцый Гандальпрамбуду.-Белдзяржбуду і Менбуду—Белжылбуду.

Правядзеньне гэтага даручыць Дзяржпляну з афармленьнем ўсёй перадачы на працягу аднаго месяца. Перадачу правесьці на грунце існуючых законаў.

17. Улічваючы, што ў будаўнічых арганізацыях занята значная колькасьць інжынэрна-тэхнічных сіл—праспартнікаў і што адыход іх ня можа быць забясьпечан заменай, прапанаваць Наркампрацы да пасылкі іх на транспарт вынучыць пытаньне аб магчымасьці замены іх, падаўшы аб гэтым у дэканы тэрмін даклад у ЭКАНА.

18. Буйное будаўніцтва, што праводзіцца гаспадарчым чынам, прыводзіць да падаражэньня будаўніцтва, таму прапанаваць усім арганізацыям работы па пабудове новых аб'ектаў і буйных рамонтаў правесьці праз будаўнічыя арганізацыі.

19. Улічваючы, што дапасаваньне тыповых праектаў і стандартаў прыводзіць да патаньненьня будаўніцтва і вызваляе тэхпэрсанал ад лішняй работы па праектаваньні, абавязаць усе будаўнічыя арганізацыі шырока выкарыстоўваць існуючыя тыповыя праекты і стандарты.

20. Даклад аб падрыхтоўцы да будаўніцтва 1931 году ўнесьці ў ЭКАНА.

21. Даручыць інспэктару НК РСІ т. Якабсону праз месяц праверыць выкананьне гэтай пастановы ў цэнтральным апараце, гарадзкім і раённым КК-РСІ мець увесь час нагляд за правядзеньнем гэтай пастановы ў жыцьцё, прыслаўшы да 15 сакавіка 1931 году вынікі выкананьня.

22. Пастанову абвясьціць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б і нарком РСІ БССР **Калнін.**

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА РЭАРГАНІЗАЦЫЮ БЕЛКАЛГАСБУДУ Ў БЕЛСЕЛЬБУД

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. У адпаведнасьці з пастановай Савету Працы і Абароны за 19 лістапада 1930 г. Беларускае будаўнічае мяшанае акцыйнае таварыства «Белкалгасбуд» рэарганізаваць у дзяржаўны трэст агульна-саюзнага значэньня па будаўніцтву ў абагуленым сэктары сельскай гаспадаркі пад назвай «Белсельбуд» і перадаць пад ведама Народнага Камісарыяту Земляробства Саюзу ССР.

2. Увесь актыў і пасыў Белкалгасбуду перадаць трэсту «Белсельбуд» па становішчы на дзень перадачы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **І. Фрыдман.**

6 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Пра назначэньне т. Амбражунаса Ўпаўнаважаным СНК БССР для правядзеньня сплаўной кампаніі 1931 г.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе назначыць тав. Амбражунаса Ўпаўнаважаным СНК БССР для правядзеньня сплаўной кампаніі 1931г.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

6 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ГРАНІЧНАГА РАЗЬМЕРУ ПАДАТКУ З БУДЫНКАЎ ДЛЯ АСОБ, ЯКІЯ АБКЛАДАЮЦЦА ПАДАХОДНЫМ ПАДАТКАМ ПА РАСКЛАДУ № 3

На падставе арт. 4 пастановы ЦВК і СНК СССР за 23 лістапада 1930 г. «Пра падатак з будынкаў і зямельную рэнту» (З.З. СССР, 1930 г., № 58, арт. 612) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе павялічыць граніч ны разьмер стаўкі падатку з будынкаў для асоб якія абкладаюцца падаходным падаткам па раскладу № 3, да 2 проц. кошту будынкаў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **І. Фрыдман.**

6 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Нар. Камісараў БССР

ПРА ЎТВАРЭНЬНЕ КАМІСІІ ПА ДРОВАЛЕСАЗАГАТОЎКАХ.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе** ўтварыць Камісію СНК для ўзмацненьня работы па дровалесазагатоўках і лесавывазцы ў наступным складзе:

Тав. Бэнэк (Старшыня), Амбражунас, Рапапорт, (з заменаю т. Мулляўка), Гінзлякевіч і Манжалей (ад саюзу Сельска-гаспадарчых і лясных рабочых).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

4 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Пра рыбную лоўлю.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Дазволіць усім грамадзянам БССР лавіць рыбу для ўласнага спажываньня ва ўсіх вазёрах і рэках без опэцыяльных дазволаў наступнымі рыбалоўнымі прыладамі:

а) ручнымі вудачкамі,
б) ручнымі сачкамі,
в) катушкамі.

Лоў усімі астатнімі рыбалоўнымі прыладамі ўтвараецца сыстэмай Белрыбаксаюзу як непасрэдна, так і на дагаворных умовах з яшчэ некаапэраванымі рыбакамі—адзіночкамі.

2. Забараніць ва ўсякі час перагароджваць рэкі, азёры і іншыя вадаёмы загарадзямі, нават і рыбалоўнымі прыладамі (забойкамі, заездамі язамі, плецянамі і да т. п.).

Забараніць таксама ўжываць для лоўлі рыбы ўзрыўныя і адуравочыя матарыялы (кукельван, вапна і інш.).

3. Забараніць зусім лавіць сіга, сляву і стронгу (фарэль), а тэрміны, у якія забараняецца лоў іншай рыбы і разьмеры, менш якіх ня можа лавіцца рыба, павінны ўстанаўляцца Народным Камісарыятам Гандлю па ўзгадненьні з адпаведнымі раённымі выканаўчымі камітэтамі.

4. Нормы штогадовага вылаву рыбы павінны ўстанаўляцца Народным Камісарыятам Гандлю разам з Інстытутам рэканструкцыі сельскай гаспадаркі імя Леніна.

5. Дазволіць Белрыбе і Навукова-дасьледчай рыбагаспадарчай станцыі лоў усялякай рыбы на працягу году для навукова-дасьледчай работы.

6. Асоб, вінаватых у парушэньні гэтае пастановы, прыцягваць да крымінальнай адказнасьці паводле 125 арт. Крымінальнага Кодэксу БССР.

7. Нагляд за выкананьнем гэтае пастановы ўскласьці на органы Народнага Камісарыяту Гандлю, міліцыю, гарадзкія, сельскія і мястэчковыя саветы.

8. Скасаваць пастанову СНК БССР за 28 сьнежня 1929 г. «Пра рыбную лоўлю». (З. З. БССР, 1930 г: № 1, арт: 5):

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **І. Фрыдман.**

6 лютага 1931 г.
г. Менск.

Давыбары акадэмікаў у БАН

Каго раіць у акадэмікі таварыства пэдагогаў--марксыстых

Заслухаўшы даклад тав. Шчарбакова таварыства пэдагогаў-марксыстых ухваляе ў асноўным плян рэарганізацыі Акадэміі. Таварыства з свайго боку лічыць неабходным:

1) Уключэньне ў плян працы БАН праблемы сучаснасьці ў справе дапамогі сацыялістычнаму будаўніцтву і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, як напрыклад: праблемы рацыяналізацыі, рабочага вынаходніцтва, новай тэхнікі, новых сацыялістычных форм і мэтадаў працы сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Разам з гэтым неабходна займацца пытаньнем вывучэньня цэлага раду праблем у гістарычным асьпекце, зьнішчыць канчаткова рэшткі нацдэмаўскай контрэвалюцыйнай мэтадалёгіі і ўтварыць ва ўсіх галінах навукі марксыцка-ленінскую мэтадалёгію.

2) Склікаць сыстэматычна канфэрэнцыі па асобных галінах навукі з прадстаўнікоў навуковых працаўнікоў, настаўнікаў, рабочых.

3) Лічыць неабходным канчаткова зьнішчыць паралелізм паміж працай БАН і рознымі Навукова-Дасьледчымі Інстытутамі, для чаго БАН павінна пабудаваць сваю сыстэму такім чынам, каб сапраўды кіраваць усёй навуковай працай БССР і стаць сапраўдным штабам марксыцка-ленінскай тэорыі ва ўсіх галінах навук. Неабходна ўключыць дэлы рад самастойных інстытутаў у сыстэму БАН у першую чаргу ўключыць у сыстэму БАН Інстытут Пэдагогікі і Пэдалёгіі

4) Утварыць актыў з культурных працаўнікоў, перадавых рабочых і калгасьнікаў навакол БАН шляхам арганізацыі брыгад, груп, якія арганізацыйна павінны кіравацца БАН і атрымліваць пэўныя заданьні па розных галінах навуковай працы.

5) Паставіць пытаньне аб выданьні навукова-папулярнага часопісу для шырокіх працоўных мас аб працы БАН

6) Неабходна выдаць навукова-папулярныя брашуры для працоўных, а таксама навуковую літаратуру на беларускай мове.

7) Паставіць на абгаварэньне на таварыстве пэдагогаў-марксыстх, альбо на асоцыяцыі таварыства пытаньні пляну рэарганізацыі БАН, дзе грунтоўна абгаварыць зьмест і кірунак працы паасобных інстытутаў і катэдры.

У якасьці правадзейных членаў у Акадэмію раіць наступных таварышоў: Панкевіча, Шчарбакова, Брустына, Платуна, Рыўліна і Кроля.

З лістоў рабселькораў

У Лёзьнянскім местачковым савеце пляны сяўбы і кантрольныя лічбы абгаворваны на групе беднаты і пленуме м.савету. Выдзелены брыгады для праверкі становішча сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару, а таксама насеньня і яго годнасьці. Поруч з гэтым растлумачваецца работа і значэньне МТС. Аднак у падрыхтоўку да веснавай сяўбы па м.савету ня ўцягнуты члены саюзаў, актыў, адсутнічае вучот ачышчанага насеньня аднасобнікамі.

В. Казлоў.

Арцель «Армія Леніна», Шклоўскага р-ну, арганізаваная ўвосень 1930 году, абапуліла ўсё сваё збожжа і прыступае да ачысткі насеньня. Калгасьнікі пачалі фрамантаваць сельска-гаспадарчыя машыны і маюць сродкі для набыцьця новых машын. Астатняе насельніцтва, бачачы рост сьвядомасьці калгасьнікаў і добрую падрыхтоўку да сяўбы, падае заявы аб прыёме іх у арцель.

Я. Нядалы.

На Шклоўшчыне плячы сяўбы ляжаць у пашках сельсаветаў: З боку некаторых сельсаветаў назіраюцца правапартыйныя адносіны да гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Ня дадзены цьвёрдыя нормы засеву заможна-кулацкай частцы вёскі. Па цэлым шэрагу сельсаветаў няма вучоту інвэнтару.

У калгасе «Ясная Зорка», Копыскага р-ну, падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі зусім не пачата; попел выкідаецца на вецер; збожжа не абмалочана.

С. Альховіч.

Не паведаміўшы інспэктара Нарасьветы і сельсавет, упякла са школы (в. Хізава, Веткаўскага раёну) настаўніца В. Бруява. Гэты літун у 1930 г. скончыў Віцебскія аднагадовыя курсы.

А.Шабін.

180 вучняў і 5 настаўнікоў Даманавіцкай школы калгаснай моладзі (Мазырчына) не ядуць ні якай работы ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці.

Верас.

Хутка скончыцца зіма, але дагэтуль для Пухавіцкай ШКМ (Жыткавіцкі р--ён) на вывозіцца лесаматар'ял дзеля пабудовы школьнага будынку. У райвыканкоме кажуць, што яшчэ «пасьпеем».

У выніках гэтага «пасьпеем» можа сарвацца будаўніцтва школы.

С.

У Недайокім сельсавеце, Буда-Кашалёўскага раёну ў індывідуальным сэктары не ачышчана ні фунта насеннага збожжа. Слаба разгорнута ачыстка насеньня і ў калгасах. Сакратар сельсавету ня ведае, колькі ёсьць ачышчальных машын у калгасах і колькі ў распараджэньні сельсавету.

Селькор Ул. Байчанка.

Некаторыя работнікі Буда-Кашалёўскага раёну толькі і робяць, што езьдзяць па калгасах і зьбіраюць харчовыя прадукты. Былы сакратар РВК, а зараз загадчык Банку, унадзіўся езьдзіць па масла ў калгас «Інтэрнацыянал». Гэты няўтомны вандраўнік 13 раз наведаў калгас, узяўшы кожны раз на ўспамін па 5 кілё масла.

Асака.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Згодна пастановы Прэзыдыўму Мен. Гар. КК-РСІ ад 23-га студзеня 1931 г. пры Гар. КК уводзіцца дзяжурства з 15-га Лютага г. г. членаў Гар. КК, мэтай дзяжурства ставіцца сувязь з шэфствуючымі арганізацыямі над дзяржапаратам, сэкцыі Гар. і с.-с., «Л. К.», рабселькорамі, прадстаўнікамі вытворчых і эканом нарад, дэлегаткамі, актывам РСІ.

Для дзяжурства вызначаны наступныя таварышы:

Кеніг, Гурэвіч, Шкірыч, Фунт, Кастрынскі, Калабаеў, Андрыеўская, Шчыкало, Готліб, Фрыдман, Малашка, Юдэльсон, Ганчар, Вількабрыскі, Гольдман, Ламаносаў, Хмелеўскі, Лійц, Барсукоў Вішнеўская, Кундрукоў, Казлоўскі, Зенчук, Эпштэйн; Шэйман, Якімовіч, Кавалёў, Вайнеровіч, Вонсак, Цімошчанка, Плетнеў, Васільлеў, Плешакоў, Бабуляк, Прахін, Рэўтовіч, Ратнер, Майзіт і Альтшулер.

Усім вышэйпамянёным таварышом патрэбна зьявіцца да 15-II-31 г. у Гар. КК (Энгельса 28, 2-гі паверх) для ўстаноўленьня дзяжурства, якія будуць штодзённа ад 7 да 9 увеч. за выключэньнем парт. дзён (7, 17, 27).

10-га лютага, а 11 гадзіне раніцы, у бібкалектары будзе разглядацца кніга М. Кульбака — «Зэльмэнгер». Завяршаюцца ўсё запісаўленьня асобы.

9-га лютага а 2 гадз. дню ў Акадэмі Навук, (пакой 19) адбудзецца паседжаньне асьпірантаў мэдыкаў. Прысутнічаньне усіх асьпірантаў тэарытычных і клінічных дысцыплін, а таксама праф. Кроля і Лушцыца абавязкова.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

10-II адбудзецца дыспут на тэму: «Дзіцячы камуністычны рух у марксыцкай пэдагогіцы». Пачатак а 7 гадзіне.

Білеты па мясцкомах і г-м Працасьветы.

Сёньня 9 лютага а 7 гадзінен ўвечары склікаецца агульны бацькаўскі сход вучняў 1-й школы—Інтэрнацыянальная 31.

Парадак дня: а) Даклад аб працы школы за 1-е паўгодзьдзе, б) справаздача камсоду.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

З ПАНЯДЗЕЛКА 9-га ЛЮТАГА

Бел рускі Другі Дзярж. тэатр	Панядзелак 9-га лютага паказ для Пралетэтуду „РЭЙКІ ГУДУЦЬ" п'есы ў 5 ці дзеях 9 абразох Пачатак а 8 гадз.
„Чырвоная Зорка"	Вялікі гукавы фільм 13 ДЗЁН (справа „пра партыі") Папярэдні продаж білетаў у тэатр. рабочай касе. Пачатак а 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса а 5 гадзіне.
Кіно-тэатр „Культура"	аўторака 10 лютага Сапраўднае жыцьцё Пачатак а 7 г., 8 г 40 хв., 10 г. 30 хв.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	Мастацкі фільм нямецкай вытворчасьці Горная баляда У галоўных ролях: Лені Рыфэншталь, Л. Трэнкер, Э. Пэтэрсон Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Ка а ад 4 гадз. 30 хв.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫЙ"	2-гі тыдзень лепшы фільм сэзону МАБУЛ (Крававы патоп) Драма ў 9 частках Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз.
Дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"	Эпізод з грамадзянскай вайны па аповесьці Д. Фурманава МЯЦЕЖ у 6 ці частках. Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. дню. Каса адчынена ад 12 гадз. дню.

Пачаўся прыём заяў на настаўніцкія 6-месячныя пэдкурсы.

Тэрмін падачы заяў да 1-3—31 г. Для паступленьня неабходна ня менш 17 год узросту; з дакумантаў—даведка аб соцыяльным і матар'яльным стане, анкета аб выбарчых правах, аб асьвеце. Прымаюцца лепш падрыхтаваныя вучні 7 клясы 7-кі. Заявы падаюцца на імя Копыскага раённага інспэктара, дзе і будуць працаваць курсы. Бядняйшыя забясьпечваюцца стыпэндыяй.

Дырэктар Аршанскага пэдтэхнікуму.

Даводзіцца да ведама ўсіх таварышоў, выбраных членамі і кандыдатамі Менгарсавету —— XIII скліканьня ——

ШТО за АТРЫМАНЬНЕМ МАНДАТАЎ

яны, пачынаючы з 5 лютага г. г.,

МОГУЦЬ ЗЬЯВІЦЦА ў канцылярыю гарадзкога савету (3-ці паверх, пакой № 8) штодзённа з 10 гадз. раніцы да 15 гадз. дня і вечарам з 19 да 21 гадз., маючы пры сабе запоўненыя анкеты (калі апошнія ўжо не адасланы ў гарадзкі савет).

Усе ўпаўнаважаныя ЗК, ФК, МК, якія да гэтага часу ня прыслалі ў гарсавет пратаколаў выбараў і дадаткаў, дадзеных да наказу, павінны безадкладна дасласьць іх у гарсавет.

Гарадзкая выбарчая камісія.

Менская Гар. КК КП б)Б—РСІ паведамляе, што 11-II-31 г. у 6 гадз. увеч. у клюбе Харчавікоў (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

СКЛІКАЕЦЦА

ШЫРОКАЯ ГАРАДЗКАЯ НАРАДА

завода-шэфаў і падшэфных устаноў па пытаньні:

Аб чарговых задачах масавай працы КК-РСІ і рабочага шэфства над дзяржапаратам.

На нараду павінны зьявіцца сэкратары парткалектываў, ячэек, старшыні ФЗМК, шэфствуючыя брыгады, трохкутнікі падшэфных устаноў, рабселькоры, „лёгкая кавалерысты", прадстаўнікі насьценгазэт і шматтыражак.

Таксама запрашаюцца на нараду, прадстаўнікі ЦКК НК-РСІ, Гаркому КП(б)Б, Гаркому ЛКСМБ, ЦСПСБ, ЦП саюзаў, і ўсіх рэдакцый газэт, „Зьвязда", „Рабочай", „Чырвоная Зьмена", „Савецкая Беларусь".

З прычыны важнасьці пытаньня неабходна своечасова паведаміць усіх вышэйдзначаных т. т. Адказнасьць за своечасовую яўку на нараду ўскладаецца на сэкратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б.

Мен. Гар. КК КП(б)Б—РСІ.

Даводзіцца да ведама студэнтаў Усесаюзнага Завочнага Інстытуту фінансава-эканамічных і рахункових навук НКФ СССР і ОРУ, што ў гор. Менску АДЧЫНЕНЫ і працуюць філіял інстытуту і кансультацыйнае бюро, для абслугоўваньня завочнікаў інстытуту, тэхнікуму і слухачоў ЦЗФК.

КАНСУЛЬТАЦЫЙНАЕ БЮРО працуе з 5 да 7 гадзін 10, 20 і 30 кожнага месяца ў Менску, Савецкая 45, пакой 14.

Для ўстанаўленьня сувязі з студэнтамі завочнікамі інстытуту і тэхнікуму, у мэтах арганізацыі дапамогі (арганізацыя жывой і пісьмовай кансультацыі па вывучаных дысцыплінах, скліканьня канфэрэнцый а таксама стварэньня адпаведных сэмінараў і г. д.) ПРАПАНУЕЦЦА ўсім студэнтам інстытуту і тэхнікуму пражываючым НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ зарэгістравацца ў Беларускім Філіале „ВЗИНО", шляхам дасылкі аб сабе наступных зьвестак:

1. Прозьвішча, імя, імя па бацьку: 2. Нацыянальнасьць; 3. Год нараджэньня; 4. Студэнт (Інстытуту, або Тэхнікуму) № пасьведчаньня; 5. На якім факультэце, аддзяленьні і цыкле; 6. Прафэсыя (месца працы і пасада); 7. Сацыяльнае паходжаньне; 8. Партыйнасьць; 9 Адукацыя; 10. Поўны адрас.

УВАГА: Слухачы Ц. З. Ф. К, якія не перайшлі ў інстытут. і тэхнікум, павінны таксама даць аб сабе гэтыя зьвесткі з паказаньнем у ц. п. 4 і 5 адпаведных данных.

Зьвесткі неабходна прысылаць не казьней 1 сакавіка па адрасу Менск, Савецкая 45, будынак НКФ БССР, пакой 14, Беларускаму Філіялу „ВЗИНО"

УВАГА Па ўсіх пытаньням, зьвязаных з інстытутам і тэхнікумам зьвяртацца ў філіял „ВЗИНО" па вышэй паказанаму адрасу.

Заг. сэктару кадраў НКФ БССР СПАРЫХІН.

Заг. Беларускім філіялам „ВЗИНО" ІВАШЧАНКА.

11 лютага 1931 г.
Цэнтральным Саветам Прафсаюзаў БССР
СКЛІКАЕЦЦА
Усебеларуская нарада старшынь райпрафсаветаў.
На нараду пазінны зьявіцца ўсе старшыні райпрафсаветаў вясковых раёнаў.
Нарада працягнецца 4-5 дзён. ЦСПСБ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
у Лужасьнянскі с.-г. ільна-пяньковы тэхнікум
(на аддзяленьне першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель)
АДТЭРМІНАВАНЫ ДА 10-га САКАВІКА 1931 г.
Правілы прыёму такія-ж як і ў іншыя тэхнікумы.
Заявы з належнымі дакумантамі накіроўваюцца па адрасу:
г. Віцебск, Прыймовай камісіі пры тэхнікуме.
Дырэктар МАРОЗАЎ.

10 лютага, роўна а 7 гадзіне ўвечары, у Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца
агульны сход Менскай філіі БелАПП'у
разам з таварыствам літаратуразнаўцаў-марксыстаў.
На парадку дня:
1. Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру (дакладчык т. Лімановуск').
2. Аб выбарах акадэмікаў у БАН (дакладчык т. Шчарбакоў),
На сход павінны зьявіцца члены БелАПП'у, члены таварыства літаратуразнаўцаў-марксыстаў, члены літстудыі БелАПП'у, члены рабочых літаратурных гурткоў. члены сэкцыі нарысу.
З прашаюцца: студэнты камвуза, асьпіранты—літаратуразнаўцы, мастакі, беларуская і яўрэйская капэлі, ансамбль народных інструмантаў.

Не 15 раз, а 22 раза в месяц
ВЫХОДИТ ГАЗЕТА
„СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫЙ РАБОЧИЙ".
орган ЦК Союза Сельхозрабочих.
КТО ЕЩЕ НЕ ВЫ